Фестываль хораў ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

АННА СКЕПКА ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2610) Год LI Беласток, 21 мая 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На Юр'е ў Ласінцы сустракаюцца сем'і з цэлага свету

Веснавое памінанне продкаў

Наколькі каталіцкія святы ў гонар памерлых напамінаюць мне познюю восень і першыя прымаразкі, настолькі праваслаўныя — Вялікдзень і майскую зелень. Падрыхтоўка да Радаўніцы ідзе крок у крок з давелікоднымі парадкамі і ачышчэннем. Хоць галоўнае свята памерлых — Радаўніца — выпадае ў аўторак, тыдзень пасля Вялікадня, да яго рыхтуюцца ўжо ў пост. Звычайна ў першыя дні Страснага тыдня ідзе вялікае прыбіранне і ўпрыгожванне магіл. Нашы продкі стараліся паспець з парадкамі да Чыстага чацвярга, каб надосвітку памыцца цэлымі сем'ямі.

Увесь паслявелікодны Светлы тыдзень, які ў праваслаўных календарах часта значаць чырвоным колерам, у асноўным прысвечаны культу продкаў. У гэты час, як у самую Радаўніцу, не сеюць збожжа, не садзяць бульбы і гародніны. Яшчэ ў паслявaенны час у Светлы тыдзень не палілі ў печах, людзі харчаваліся ядой падрыхтаванай на ўвесь тыдзень.

Культ продкаў яшчэ сёння захоўвае шмат абрадаў дахрысціянскай пары. У прыходах, дзе могілкі побач царквы, да памерлых ідуць ужо пасля Усяночнай. Апрача бласлаўлення „Хрыстос уваскрос!" пакідаюць на магіле асвечаную яду — яйка, кусок велікоднага пірага „паскі", а дзеткам кладуць цукеркі. Часам можна пачуць галашэнні, у якіх жаль па страце блізкіх мяшаецца з асабістымі пажаданнямі (у сёлетняе Юр'е мне пашчасціла прыслухацца галашэнню старажылкі, якая прасіла памерлых продкаў, каб дапамаглі ў навуцы беластоцкаму ўнуку Вальдку).

Асвячэнне магіл пачынаецца ўжо ў Светлы тыдзень, у беластоцкай парафіі Усіх Святых — у сераду. У гэты дзень з'язджаюцца сваякі з цэлага свету, каб разам сустрэцца і памаліцца ля магілак родных. Тут таксама сярод каляровых пластмасавых букетаў і лямпачак сустрэнем на магілах яйкі і цукеркі. Праўда, у польскамоўных гарадах памінальныя дні больш вядомыя як „Niedziela przewodnia" або „Poniedziałek przewodni", і адбываюцца яны ў названыя дні. Вясковыя парафіі трымаюцца „Провадаў", якія ў асноўным асацыююцца з панядзелкам, тыдзень пасля Вялікадня. У многіх мясцінах, як у Дубічах-Царкоўных, свята мае прызнакі шумнага прыхадскога фэсту.

Даволі складана было знайсці парафію, якая адзначае Радаўніцу згодна з тэрмінам, значыць — у аўторак, тыдзень пасля Вялікадня. Такі старажытны працяг захаваўся яшчэ ў Трасцянцы, дзе свята называюць па-падляшску *Радусна*. Не перашкаджае тут факт, што тры дні пазней, як у бягучым годзе, выпадае Юр'я — прыхадскі фэст на могілках. Тады яшчэ раз з'язджаюцца сем'і і асвячаюцца магілы.

Вясновыя памінанні паўтараюцца яшчэ ў час прыхадскіх фэстаў і завяршаюцца дзень перад Сёмухай, у *Бацькоўскую памінальную суботу*. Пасля пачынаюцца летнія памінальныя абрады...

Ужо сам пералік разнавідных тэрмінаў можа навесці закалот, які, дарэчы, мэтанакіраваны. Дахрысціянскія трызны, якія ладзілі ў Радаўніцу, шакіравалі царкоўнікаў, асабліва рытуальныя гасціны са спевамі і галашэннямі ля магіл (зараз у многіх парафіях абедаюць за мурам могільніка).

Вакол старой даты і абрадаў заўсёды панавала атмасфера таемнасці і нефармальнасці. Добра памятаю, як разам з сябрамі гналіся мы на могілкі ў Ласінцы, каб падглядаць практыкі бабуль і дзядуляў. Гэты дзень, у адрозненні ад Провадаў, называлі тут „Бабскае свята" (ці не з-за іранічнай назвы „Дзядоў"?). Факт, наколькі на Провады магілы асвячаў бацечка, а побач стаялі сяляне ў розным узросце, настолькі дзень пазней, значыць, у аўторак на Радаўніцу, абрад спраўлялі адны старажылы і пераважалі тут бабулькі. Набліжацца да месца было страшнавата, іх галашэнні напаміналі тэатральны плач, ад якога хацелася і плакаць, і смяяцца. Лямант і жаль па пакойніку мяшаўся з плачам і аповедамі пра горкі лёс на зямлі. Часта, як у згаданым выпадку, жывыя прасілі дапамогі пакойных продкаў. Абрад завяршаўся трызнай. Каля паасобных магіл збіраліся аднавяскоўцы, рассцілалі там палавік і даставалі прынесеную з хаты яду. На ім было ўсё тое, што на велікодным стале — і пірог, і яечка, і каўбаска, і самагонка, якую распівалі адным кілішкам згодна з рухам сонца. Калі трызна адбывалася ля магілы мужчыны, яму абавязкова паліваліі гарэліцу проста на магілу. Запамяталіся таксама вяртанні з могільніка, старажылы былі шчаслівыя, часам спявалі.

Прыведзены прыклад трыццацігадовай даўнасці, і можа патыхаць даўніной. Старажытныя абрады добра захаваліся ў Беларусі, дахрысціянскія практыкі ўдала зліліся з царкоўным і сучасным канфармізмам. На могілках у Смалянах, што на Магілёўшчыне, ля магіл можна пабачыць столікі і лаўкі, якія служаць дзеля выгаднейшага здзяйснення трызны.

Ганна Кандрацюк

Слава Герастрата ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Сёння, у час неабальшавізму ў Беларусі, па ўсёй краіне, а на Гродзеншчыне асабліва, высякаюцца лясы і паркі, прысады абапал дарог, нішчыцца старадаўняя планіроўка гарадоў і мястэчак, архітэктурныя асаблівасці. Дарога глядзіцца нібы пустыня, а гарадскую зямлю без усялякай меры закладаюць пліткай, празванай у народзе „губернатарскай"...

Традыцыя і новае ☞ 2

Ежы Плютовіч

Нядобразычліўцы кажуць, што такога Янку Купалу назначылі класікам беларускай літаратуры па асабістым рашэнні Іосіфа Сталіна, адыёзнай асобы, калі ў той час прыгаворвалі на спляжанне, смерць пад абсурднымі абвінавачаннямі цвет самых таленавітых пісьменнікаў, такіх як Мрый, Калюга, Жылка ці Чарот...

У Ягадніках ☞ 8

Аляксей Мароз

Людзям з Ягаднік да вайны цяжка было гаспадарыць. На лугах побач вёскі часта стаяла вада і вымакала трава. Збожжа сеялі на вышэй распаложаных у напрамку Дубіч-Царкоўных палях. Аднак гэтыя землі былі дрэннай якасці і вырошчвалі на іх у галоўным жыта і авёс. Умовы гаспадарання змяніліся ў выніку ліквідацыі цераспалосіцы і меліярацыі зямель, праведзеных пасля вайны...

Суд над „Нівай" ☞ 9

Раіна Стэфанчук

Назіральнікі за працэсам былі ўпэўненыя, што на гэтым пасяджэнні будуць заслуханы выключна паказанні сведкі Івоны Гродзкай — супрацоўніцы Дэпартамента веравызнанняў ды нацыянальных і этнічных меншасцей Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якая раней працавала ў Міністэрстве культуры, з якога пераведзены быў яе дэпартамент...

У Агародніках ☞ 11

Аляксандр Вярбіцкі

У пачатку Агароднік, з боку Вулькі-на-Бугу, два крыжы: адзін драўляны, стары, пра якога пачаткі не помняць нават сённяшнія старажылы, і навейшы, з бетоннай падставай, пастаўлены 9 чэрвеня 1972 года. Калісь побач яго выводзілі пакойнікаў на могілкі ў Сямятычы, але калі з другога канца вёскі паклалі асфальт на дарозе ў Клекатава, тады і пакойнікаў сталі вадзіць лепшай дарогай...

9 770546 196000

Герастратава слава

Праз далёкія стагоддзі слава грэка Герастрата, які дзеля таго, каб увекавечыць сваё імя, спаліў храм Артэміды Эфескай (гэтае архітэктурнае збудаванне прылічалі да сямі дзівосаў свету), не дае спакою паслядоўнікам. Колькі каштоўнасцей разбурылі ў Беларусі за апошнія дзвесце гадоў прыхадні-варвары і мясцовыя вандалы, цяжка злічыць. А зараз надышоў час разбурэнняў завуаляваным, прыхаваным чынам.

Бальшавікі-саветы, калі дарываюцца да ўлады, не могуць існаваць па-іншаму, каб не нішчыць хоць-што. У залежнасці ад канкрэтнага гістарычнага перыяду гэта могуць быць людзі (ленінскія канцлагеры, „творча" пазней развітыя Сталіным), храмы (камуністычны ваюючы атэізм ва ўсе часы СССР), навука і творы мастацтва (хрушчоўскае змаганне з генетыкай, кібернетыкай і абстракцыянізмам), прыродныя балоты (брэжнеўская меліярацыя), вінаграднікі (перабудовачная кампанія за цвярозасць).

Сёння, у час неабальшавізму ў Беларусі, па ўсёй краіне, а на Гродзеншчыне асабліва, высякаюцца лясы і паркі, прысады абапал дарог, нішчыцца старадаўняя планіроўка гарадоў і мястэчак, архітэктурныя асаблівасці. Дарога глядзіцца нібы пустыня, а гарадскую зямлю без усялякай меры закладаюць пліткай, празванай у народзе „губернатарскай". Усё гэта робіцца пад выглядам парадкавання тэрыторыі і рэстаўрацыі будынкаў.

Старажытнай Гародні, сённяшняму Гродну, больш-менш пашанцавала ў гады другой сусветнай вайны — архітэктурныя страты былі значнымі, але не такімі страшнымі як у іншых месцах. Гэтага даравацъ гораду кіраўнікі не маглі. У 1961 годзе быў узарваны самы велічны гродзенскі храм — Фара Вітаўта, гісторыя якога складала шэсць стагоддзяў. Пазней была разбурана званіца насупраць Брыгідскага кляштара. Планавалася пракласці праз стары цэнтр шырокую магістраль да Нёмана, дзе стаіць Каложская царква. На шчасце, гэтая задума не здзейснілася. Затое ў сямідзесятыя гады былі знішчаны цэлыя кварталы пад будаўніцтва пачварных з архітэктурнага гледзішча гарадскога і абласнога выканкамаў, непазнавальна быў зменены непаўторны ландшафт у раёне Гарадніцы, пазней бязлітасна зруйнавалі гістарычны чыгуначны вакзал.

Апошнім часам на ўлады напаў сапраўдны біч пераробак. Не так даўно пры будаванні новага стадыёна цалкам быў разбураны стары, які калісьці збудавалі на жыдоўскіх могілках. Прытым павыварочвалі бульдозерамі магільныя пліты і чарапы, выкарчавалі ўсе дрэвы, нават на вуліцы Горкага (ранейшая Грандзіцкая). Цяпер там сапраўдныя пылавыя буры. Пазамінулы год „культурную рэвалюцыю" здзейснілі ў Ваўкавыску, які рыхтавалі да дажынак. Без усялякіх археалагічных даследаванняў экскаватарамі бязлітасна быў перакапаны ўвесь гістарычны цэнтр. Цяпер яго займае адна з самых вялікіх плошчаў у Еўропе, запланаваны фантан так і не паўстаў.

Маштабы цяперашніх працаў у Гродне сапраўды ўражваюць. Але замест таго, каб аднаўляць разбуранае раней, хочуць зрабіць вялізную пляцоўку для дзяржаўна-саўковых гулянак, знішчаючы культурныя пласты. Відавочна, што праект складаўся паспешліва і непрадумана. Прыкладам, частку транспартнай плыні збіраюцца пусціць па вуліцы Давыда Гарадзенскага, якую можна лічыць аортай старога горада. Машыны пойдуць у 30 метрах ад Каралеўскіх замкаў XVI і XVIII стст., моцная вібрацыя непазбежна будзе іх разбураць. А яшчэ бліжэй стаіць жаночы манастыр, жыццё якога стане звышцяжкім. З думкай навукоўцаў і грамадскасці, як заўсёды, не лічацца. Подпісы і галасы вядомых навукоўцаў і культурных дзеячаў улада праігнаравала. А некаторыя „вучоныя", ад якіх шмат залежыць, паспяшаліся заявіць, што нічога страшнага не адбываецца. Відаць, ім таксама карціць герастратава слава.

Уладзімір Хільмановіч

Між традыцыяй і новай эпохай

Як прыгожа быць класікам, — уздыхнуў быў мой знаёмы паэт-постмадэрніст. Вось і слава ды хвала, належныя элітам. Экзіставанне ў райскім садзе. Асобны пункт у энцыклапедыі, старонка ў падручніку гісторыі літаратуры, клуб намоленых вернікаў, прэзідэнт, які цытуе твае больш трапныя крылатыя словы ў час адсвяткоўвання нацыянальнага свята...

Я адчуў сябе, аднак, сівабародым старэчам, якога віной з'яўляецца тое, што задоўга жыве, бо зашмат памятае. Быць класікам, — спыніў я паэта, — то таксама тое, што ніхто класічных твораў не чытае, толькі бяздумна паўтарае выцягнутыя з іх лозунгі, цытаты, пагаворкі, якія з'яўляюцца малазначнымі, выцертымі фразамі. А школьная моладзь скрыгіча зубамі, бо заганяюць яе штудзіраваць класічныя здабыткі пад насіллем ды пагрозай. Здабыткі класіка мёртвыя, не нараджае ён новага жыцця.

Літаратурная творчасць, вось, з'яўляецца няўдзячнай галінай, якая прыносіць як і творцу, так і свядомаму атрымальніку, шмат згрызот і пакут. Гэта зачараванае кола, паколькі творчасць нараджаецца якраз з болю існавання і кайдан пакут. Хто ж стрывае, калі не адзінкі найбольш цвёрдыя, наймацнейшыя. Нядобразычліўцы кажуць, што такога Янку Купалу назначылі класікам беларускай літаратуры па асабістым рашэнні Іосіфа Сталіна, адыёзнай асобы, калі ў той час прыгаворвалі на спляжанне, смерць пад абсурднымі абвінавачаннямі цвет самых таленавітых пісьменнікаў, такіх як Мрый, Калюга, Жылка ці Чарот.

Рускі філосаф Мікалай Бярдзяеў лічыў Фёдара Дастаеўскага геніяльным пісьменнікам і геніяльным мысляром, нават прарокам і візіянерам, які прадбачыў адраджэнне нашай цывілізацыі ў духу любові, свабоды і праваслаўя. Затое выдатны пісьменнік Уладзімір Набокаў лічыў творчасць Дастаеўскага памылкай, плодам істэрыкі і сантыменталізму, а яго самога няспоўненым драматургам, які пакінуў кепска скампанаваныя, разлезлыя раманы, паколькі размінуўся з прызваннем сцэнічнага аўтара.

Аўстрыйскі пісьменнік Роберт Музіль з'едліва выказваўся аб пісьменніках-мандарынах, якія апынуліся ў цэнтры ўвагі масмедыяў ды іграюць ролю дзяжурных па актуальных тэмах. Такім пісьменнікам лічыў Тамаса Мана, які, бы па заказе, з годнасцю і цырымонна выказваў высакамоўныя банальнасці.

Папраўдзе, у кожным з нас сядзіць адначасова класік і рамантык. Класік азываецца тады, калі спрабуем у рэфлексіі спыніць даследаваны быт быццам праколатага шпількай матыля, а гэта з'яўляецца спробай прымянення метафізічнага метаду. А паколькі наш быт варухлівы, вечнажывы, значыць, кожная метафізіка з'яўляецца спробай навязаць схему, штучныя рамы. Супраць схем выступае рамантык; той жа рамантык бунтуецца супраць мёртвых, запыленых экспанатаў, памешчаных у вітрынах, вакол якіх дэфілююць наведвальнікі з разумнымі, засяроджанымі тварамі. А думаюць яны аб нічым.

Успомнены раней Бярдзяеў палічыў кнігу „Ойча наш" польскага філосафа XIX ст. Аўгуста Цяшкоўскага выдатным творам, а нават у Польшчы ён малавядомы, экзістуе на абочыне бытавання, гэты твор грунтоўна забыты; выдалі яго адзін раз, шмат гадоў таму, ужо пасля смерці аўтара, малым тыражом. Аказалася, прачытаў яго лаўрэат Нобелеўскай прэміі Чэслаў Мілаш; патрактаваў яго зняважліва, як няўдалы плод, напісаны кепскай, недасканалай мовай. Па-мойму, твор Цяшкоўскага варты найвышэйшай увагі. На думку Цяшкоўскага, у Гасподняй малітве „Ойча наш" увекавечаны зашыфраваны запіс будучыні чалавечага роду, малітва гэтая прадказвае надыход трэцяй у гісторыі свету эпохі; а мае гэта быць эпоха чыну, ўладарання Святога Духа. Першая эпоха была эпохай Айца — старажытнасць; сёння мы жывём у эпоху Сына — якая распачалася з прыходам на свет Хрыста і росквітам хрысціянства. Новую, надыходзячую эпоху ствараем разам, паколькі здабываем новую свядомасць. Малавер Мілаш схіляўся, пэўна, да песімістычнага бачання надыходзячага часу. Аптымістычная ўява Цяшкоўскага бліжэйшая духу праваслаўя, што заўважыў Бярдзяеў.

Усё ж, ад нас залежыць, колькі скарбаў культуры ўратуем з мінулага, захаваем ад бяздоння бязлітаснага часу; залежыць ад нас, каб здабыткі пакаленняў трактаваць сур'ёзна і ўважліва, крытычна, чаму служыць радасць бытавання з кнігамі ўсялякімі. Лепш гэта, чым паддацца хвалі лёгкадумнай бяздумнасці, якой спадарожнічаюць насілле, варожасць, чыстае зло, новае варварства.

Ежы Плютовіч

Вачыма еўрапейца

Што на гэта Палац?

Прэзідэнт Лех Качынскі ў час нядаўняй міжнароднай канферэнцыі „Супольная ўява супольнага суседства" ў Вільні заявіў: „Дэмакратычная апазіцыя ў Беларусі павінна падтрымлівацца ўсялякімі мірнымі сродкамі". Ужо значна раней партыя прэзідэнта Качынскага — Права і справядлівасць (ПіС) падтрымлівала апазіцыю, супрацьстаяла парушэнням правоў чалавека, невыконванню дэмакратычных прынцыпаў і дыктатарскім пасяганням у Беларусі. Выдвараны беларускімі ўладамі дарадчык пасольства РП у Мінску Марэк Буцько нядаўна заявіў, што прэзідэнт Польшчы з першага дня прабывання на пасадзе выразна акрэсліў сваю пазіцыю ў адносінах да беларускіх улад, выказаўся за іх палітычнай ізаляцыяй паралельна з падтрымліваннем незалежных СМІ, няўрадавых арганізацый і дэмакратычных партый.

Яшчэ ў кастрычніку 2004 г. віцэ-старшыня ПіС Марэк Юрэк, сёння маршалак Сейма (другая пасля прэзідэнта асоба ў краіне) гаварыў аб рэферэндуме, які меў бы даць магчымасць балатавацца Аляксандру Лукашэнку ў прэзідэнцкіх выбарах у чарговы раз:

— На міжнародным форуме неабходным з'яўляецца рашучы пратэст па прычыне парушэнняў у Беларусі агульнапрынятых дэмакратычных прынцыпаў.

У адносінах да Беларусі ўвесь час адрозную пазіцыю выказвала кіруючая разам краінай кааліцыянтка ПіС — Самаабарона. Яшчэ восенню 2004 г. Альфрэд Буднэр, дэпутат тае партыі, заявіў з сеймавай трыбуны, што ўмешвацца ў справы суседа не толькі няёмка, але і нельга. Аляксандр Лукашэнка мог дагэтуль разлічваць на самога Анджэя Лепэра. Ягоныя візіты ў Беларусь (апошняя па асабістым запрашэнні Лукашэнкі) ахвотна выкарыстоўваліся рэжымнымі СМІ. Старшыня Лепэр, інакш чым міжнародныя наглядальнікі, не прыкмеціў прыкладаў парушэнняў дэмакратычных і грамадзянскіх правоў. Захапляўся лукашэнкаўскай сацыяльнай палітыкай. Пралукашэнкаўскі сенатар Мікола Чаргінец, спасылаючыся на размову з Анджэем Лепэрам у час апошніх парламенцкіх выбараў у Польшчы, прызнаўся:

— Паводле яго (Лепэра), з такім узроўнем дэмакратыі Польшча не мае права вучыць Беларусь дэмакратыі.

Сённяшні віцэ-прэм'ер ад Самаабароны ў размове з сенатарам Чаргінцом заявіў, што ягоная партыя будзе падтрымліваць Беларусь Лукашэнкі як у Польшчы, так і ў Страсбургу.

У час асенніх парламенцкіх выбараў у Польшчы і зараз пасля назначэння віцэ-прэм'ерам і міністрам сельскай гаспадаркі Анджэй Лепэр не выдаў ніякай заявы, якая магла б сведчыць аб змене яго думання і пазіцыі Самаабароны наконт Беларусі. Найгорш, бо небяспечна — з пункту гледжання польскіх дзяржаўных інтарэсаў — магло б быць, калі б каля прэзідэнта Качынскага і нованазначанай міністр замежных спраў Анны Фотыгі, вёў ён сваю, значна адрозную польска-беларускую палітыку, а, можа, нават і польска-еўрасаюзна-беларускую і то незалежна ў якім характары: палітычным ці выключна гаспадарчым. Зважаючы асабліва на тое, што ягоныя некаторыя выказванні ў адносінах да Расіі прагучалі адразу пасля ўваходу ва ўрад. Мае ён тут, як сказаў, выкарыстоўваць уласныя кантакты. У Беларусі, як паказваюць прынамсі два апошнія гады, уласныя кантакты ў Анджэя Лепэра таксама ёсць. З рэжымам Аляксандра Лукашэнкі, як кажуць на мове дыпламатыі, цёплыя і сардэчныя. Што на гэта скажа Прэзідэнцкі палац, які, здаецца, мае адыгрываць ключавую ролю ў польскай замежнай палітыцы, асабліва ўсходняй?

Мацей Халадоўскі

Самы гарачы прыём на канцэрце „На народную ноту” мелі казахскія маладыя спевакі

Хор з Чанстаховы

Хваліце песняй Госпада

Фонд „Царкоўная музыка” ў Гайнаўцы, пры супрацоўніцтве з Беластоцкай операй і філармоніяй сарганізавалі ў Беластоку ўжо 25 раз „Фестываль спяваючай душы”. „Фестываль служыць таму, каб дзякуючы музыцы забыць аб падзелах, пазнаваць і лепш разумець адны адных”, — сказаў дырэктар фестывалю Мікола Бушко.

Незалежна ад нацыянальнасцей, расы, палітычнага светапогляду, веравызнання ды строю — у фестывалі прымалі ўдзел праваслаўныя з розных цэркваў: пратэстанты, яўрэі, грэка-каталікі, стараверы, мусульмане. Пачалося было мерапрыемства — з Дзён царкоўнай музыкі — у драўлянай царкоўцы (не быў узведзены яшчэ сабор Святой Тройцы) у рабочай Гайнаўцы, і тая „Гайнаўка” засталася на плакатах, паказваючы свету „першы і найбольшы” фестываль праваслаўнай душы. Ад пачатку мерапрыемства арганізуюць людзі свецкія. Вялікімі сябрамі фестывалю былі айцец Антон Дзевятоўкі і мітрапаліт Васілій, а таксама шматлікія духоўныя і свецкія асобы з 32 краін свету. Фестываль не меў амбіцыі стаць фестывалем царкоўнай песні ці літургічнай падзеяй. „Найвыдатнае мастацкае мерапрыемства не заменіць містэрыі, якой з’яўляецца літургія. Мы ніколі не хацелі ўступіць у сферу сакрум, такую важную для кожнага з нас, — тлумачыць Мікола Бушко. — Ці ж можа быць лепшы прыклад пашаны і адпаведна ўспрынятай экуменіі, чым удзельніцтва ў Фестывалі хораў розных веравызнанняў, якія супольна ўсхваляюць Госпада?” Такую формулу адобрыла да гэтай пары 530 калектываў. Сягаюць яны, перш за ўсё, да крыніц, музыкі пачаткаў хрысціянства, якая развівалася стагоддзямі. Музычны патранат трымае над фестывалем Кшыштаф Пэндэрэцкі, капмазітар сусветнай славы, якога твор „Ютрань” быў прадстаўлены на фестывалі. Доказам прызнання МФЦМ рэалізатарам лозунгу „Спявайце Госпаду песню новую” з’яўляецца таксама візіт групы кампазітараў з Расіі, Украіны, і іншых краін, якія на канферэнцыі пасля фестывалю падзяліліся сваім вопытам па складванні твораў абапертых на традыцыі Праваслаўнай царквы.

— Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі з’яўляецца не толькі полем высакароднага змагання хораў, якія ўдзельнічаюць у конкурсных аглядах, але таксама ва ўз’яднанні ў справе выспеўвання Божай Магутнасці і Красы, — сказаў а. Георгій Шурбак, дырыжор Мужчынскага калектыву царкоўнай музыкі і член журы фестывалю, якога прозвішча лічыцца ў свеце сінонімам царкоўнай музыкі, і які супрацоўнічае з Фестывалем з 1982 г. Ягоны мужчынскі хор, пры падтрымцы адной жанчыны, разам з Камерным хорам „Кіеў” пад дырэкцыяй Мыколы Гобдыча, пачаў фестываль, які працягваўся з 9 да 17 мая 2006 г. Прыняло ў ім удзел 23 калектывы — ад парафіяльных хораў да вялікіх прафесійных, якія выступалі не толькі ў Беластоку, бо ўжо ў час фестывалю рушылі адразу на гастролі па ўсёй Польшчы, прадстаўляючы скарбы царкоўнай песні. Зала беластоцкай філармоніі штодзень запаўнялася ўсхваляванай публікай рознай нацыянальнасці.

Гучалі песні візантыйскага, грузінскага, знаменнага, кіева-пячэрскага распеваў, „прастапенія”, ананімныя (м.інш. беларускія рэлігійныя кантаты з XVIII ст. у выкананні гомельскага хору), Паўла Часнакова, Дзмітрыя Бартнянскага, Аляксандра Архангельскага, Добры Хрыстова, Мікалая Кядрова (выканалі іх м.інш. сын аўтара і ўнук заснавальніка парыжскага хору Кядрова), Сяргея Рахманінава, Міхаіла Глінкі, а таксама творы м.інш. дырыжора Тамаша Бубно ці Рамуальда Твардоўскага, як і першы раз выкананае на фестывалі ягонае „Алілуя II”.

Сярод выканаўцаў найбольш гарачы прыём мела, таксама і на канцэрце „На народную ноту”, здаецца, казахская група маладых спевакоў (сярэдні ўзрост — 27 гадоў). Амаль усе яны мусульмане. Амаль кожны дзень агляду слухачамі трактаваўся як гала-канцэрт, вялікае свята душы. „І невядома, калі канчаецца песня, а калі пачынаецца малітва...”

Тэкст і фота Міры Лукшы

Узнагароджваюцца браты Грыгорыс і Пэтрос Папаэмануіл

Дырыжор іерадыякон Гяронцій і Ірэна Парфянюк (кіраўнік бюро Фестывалю)

Журы пад кіраўніцтвам кампазітара і выкладчыка Рамуальда Твардоўскага прызначыла ўзнагароды. У катэгорыі **парафіяльных** хораў два **II** месцы атрымалі каталіцкі Кафедральны хор „Carmen” (дырыжор Бажэна Баярын) з Беластока, які ўжо раней быў лаўрэатам фестывалю, і праваслаўны хор Успення Божай Маці ў Ярабіне ў Славакіі (дырыжор Анна Дэравяннікава), а **першае** выспявалі: хор Санкт-Пецярбургскай Праваслаўнай духоўнай акадэміі (дырыжор Ірына Хмялеўская) і Брацкі хор Кіева-Пячэрскай лаўры (дырыжор іерадыякан Гяронцій; ад пачатку існавання хор запісаў восем дыскаў сакральнай песні).

У катэгорыі **аматарскіх свецкіх** хораў: **III** — Мужчынскі маладзёжны хор грамадскага таварыства „Lira” з Варшавы (дырыжор Ян Вёнцак); **II** — дзявочы хор „Раніца” з Мінска (дыр. Віктар Масленнікаў); **I** — хор Чанстахоўскай палітэхнікі „Collegium Cantorum” (дыр. Януш Сядляк), хор Даўгаўпільскай музычнай школы з Латвіі (дыр. Яўген Усцінскаў).

У катэгорыі **прафесійных камерных** хораў **III** месцы заваявалі: Мужчынскі ансамбль „Радзівілы” з царквы Іконы Божай Маці „Усіх тужлівых Радасць” з Мінска (дыр. Вольга Янум) і Мужчынскі хор „Gavriil Musicescu” з Кішынёва ў Малдове (дыр. Эмілія Марару); **II** — Камерны хор Днепрапятроўскай філармоніі з Украіны (дыр. Вольга Пучкова); **I** — Візантыйскі мужчынскі ансамбль „Св. Эфраім” з Будапешта, у якім выступаюць грэка-каталіцкія спевакі русінскай нацыянальнай меншасці (дыр. Тамаш Бубно).

У катэгорыі **прафесійных хораў III** месца журы назначыла хору „Credo” з Кішынёва (дыр. Валянціна Балдурат); **II** — Камернаму хору філармоніі з Гомеля (дыр. Алена Сакалова) і Камернаму хору імя С. Рахманінава з Тамбава з Расіі (дыр. Уладзімір Казлякоў); **I** — Камернаму хору Нацыянальнага тэатра оперы і балета імя К. Байсеітавай з Астаны ў Казахстане (дыр. Ерзан Даутаў).

Спецыяльныя ўзнагароды журы прысвоіла Візантыйскаму хору „Drama’s Domestics” з Драмы ў Грэцыі (дыр. Грыгорыс і Пэтрос Папаэмануіл) і стваральніцы ды шматгадовай дырыжорцы вясковага хору з Ярабіны Анне Дэравяннікавай, а ганаровы дыплом за распаўсюджванне праваслаўнай песні ў Італіі і ва ўсёй Заходняй Еўропе — Аляксандру Руа Руі з Вакальнай групы „Eufone” з Турына.

Дзе шукаць тую праўду?

Я ўжо не раз пісаў у „Ніве” пра Водную суполку „Тыневічы” з сядзібай ў Нарве, якая сваёй дзейнасцю ахоплівае ўсю тэрыторыю Нарваўскай гміны. Суполкай кіруе спадар Асташэўскі, былы аграмеліярант, пенсіянер. Ён стараецца ў сакавіку выслаць усім гаспадарам плацежныя ордэры за догляд меліярацыйных равоў і дрэнаж. Вельмі добра ён клапоціцца аб заплаце, але пра ачыстку равоў не дбае. На некаторых равах меліярацыйных работ не было каля 10 гадоў, а сяляне плацяць складчыны кожны год. Калі б так выглядаў догляд меліярацыйных равоў пры камуне, і калі б нехта паскардзіўся войту або пайшоў са скаргай у Гмінны камітэт ПАРП, то спадаром Асташэўскім, за яго „работу”, заняўся б пракурор. Цяпер няма куды паскардзіцца, а спадар Асташэўскі атрымлівае і пенсію, і сяляне плацяць яму за тое, што сядзіць у пакойчыку пры Управе гміны і нічога не робіць.

Прывёў я прыклад толькі аднае вёскі Бялкі, але і ў іншых такая ж самая бесталковіца на меліярацыйных равах. Месцамі равы пазарасталі так моцна, што ўжо мала іх відаць.

Калі водныя суполкі былі згуртаваныя ў Саюзе водных суполак, а ў Гайнаўскім павеце старшынёю быў Уладзімір Коўнер, тады быў парадак. Я асабіста на працягу пяці гадоў працаваў пастаянным рабочым у Воднай суполцы ў Трасцянцы і тады быў вельмі добры нагляд. Гэта можа пацвердзіць войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч, якая тады працавала ў Павятовым саюзе водных суполак у Гайнаўцы. Ёй гэтыя справы вельмі добра вядомыя.

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

Чароўныя Сынковічы

У 19 нумары „Нівы” ад 7 мая 2006 г. прачытаў я артыкул пра Сынковічы. Так шчасліва склалася, што я сам быў у Сынковічах і бачыў тамашнюю царкву і мясцовасць. Гэта вельмі чароўнае месца. Захапіў мяне сад і астанкі магілаў. На жаль, у царкве я не быў, бо якраз не было святара.

Не так даўно папала мне ў рукі кніга Юзэфа Гадлеўскага „На зломе эпох” (Józef Godlewski, „Na przełomie epok”). Гадлеўскія гаспадарылі ў Сынковічах да II сусветнай вайны. Гэта надзвычай цікавая кніжка, нешта накшталт мемуараў. Аўтар апісвае і час, і людзей. Са старонак кніжкі адчуваецца, што аўтар любіў гэтае месца і людзей, якія там жылі. Ён моцна атаясамліваўся з пражываючымі там беларусамі, што, на жаль, рэдкая з’ява ў іншых аўтараў, якія выводзяцца з беларусаў.

Жадаю далейшых цікавых артыкулаў на старонках „Нівы”.

Здзіслаў ЛІПСКІ

Я тлумачу гасцям, што мы — праваслаўныя беларусы, гасцінны народ і жывём у згодзе з іншымі веравызнаннямі і нацыянальнасцямі. Многія наведваюць рэгіянальны скансэн на акраіне Белавежы...

Наша радная ў Белавежы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Аннай СКЕПКА — раднай Белавежскай гміны (выбранай ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта), былой настаўніцай, якая зараз займаецца турыстычнай дзейнасцю.

— Набліжаецца канец паўнамоцтваў Гміннай рады, у якой Вы засядалі. Ці многа ўдалося зрабіць у карысць мясцовага насельніцтва?

— Наша Рада распачала працу з вялікімі гміннымі даўгамі, якія трэба было сплачваць. Мала грошай заставалася нават дзеля таго, каб выступаць за еўрасаюзнымі сродкамі, якія трэба дафінансоўваць з уласнага бюджэту. Удалося нам зрабіць тэрмамадэрнізацыю прадшколля і памяняць на ім дах. Зараз праводзіцца дацяпленне школьнага будынка, мяняюцца ў ім вокны і ўся цеплавая сетка будынка. Цяпер завяршаецца разбудова ачышчальні сцёкаў. У нашай гміне пракладаюцца таксама водаправоды і каналізацыйная сетка. Неўзабаве адбудзецца аўкцыён па выбару прадпрыемства, якое будзе будаваць каналізацыю і мадэрнізаваць водаправоды ў Грудкі, Пагарэльцы, Тэрэміскі і Буды.

— Вы гаворыце пра наваколле, а як з каналізацыяй у самой Белавежы?

— Амаль ва ўсёй Белавежы пракладзена ўжо каналізацыйная сетка. Асталося яшчэ палажыць каналізацыйныя трубы даўжынёй у 200 метраў па вуліцы Мастовай.

— Вы сказалі, што праводзіцца тэрмамадэрнізацыя школьнага будынка. Ці прадбачваецца адбудова старога будынка, які пацярпеў ад пажару?

— Мы прадбачваем адбудоўваць стары школьны будынак, які гарэў і гэтая інвестыцыя будзе каштаваць больш за 2 мільёны злотых.

— У Белавежы апошнім часам распачалі дзейнасць новыя гатэлі і турыстычныя ўстановы. Ці ад гэтага павялічыцца гмінны бюджэт?

— Якраз многа прадпрыемстваў, якія адкрылі сваю дзейнасць у нашай мясцовасці, заснаваны былі ў іншых гарадах і ў бюджэты гэтых мясцовасцей адводзяць яны падаткі. Нам застаецца толькі падатак ад гатэльных будынкаў і ўчасткаў пад імі. 90% тэрыторыі гміны займаюць лясы, ад якіх таксама невялікі падатак. Вялікай сельскагаспадарчай прадукцыі ў нашай гміне не было і не будзе і таму сельскагаспадарчы падатак вельмі малы. Звярына нішчыла раслінныя культуры і таму зараз многа зямлі ляжыць аблагом.

— Белавежскую гміну, так як і суседнія, не абмінула беспрацоўе.

— Жыхары Белавежы і суседніх мясцовасцей, апрача турыстыкі, знаходзяць яшчэ работу ў Белавежскім нацыянальным парку, прыватных прадпрыемствах, якія высякаюць лясы, школе і гміннай управе. Аднак магчымасці апошніх устаноў абмежаваныя і многа маладых людзей выязджае ў пошуках работы ў іншыя гарады.

— Многа турыстычных устаноў у Белавежы распаложаных па галоўнай вуліцы Вашкевіча. Ці прадбачваецца рамонт гэтай вуліцы?

— Вуліца Вашкевіча з’яўляецца нашай візітнай картачкай, а асфальт на ёй моцна знішчаны. З аднаго боку паложаны тратуар. Трэба рамантаваць асфальтную паверхню дарогі і класці тратуары з другога боку вуліцы. Павятовыя ўлады выступілі з праектам рамонту гэтай (павятовай) дарогі за еўрасаюзныя сродкі, але я не ведаю якое зараз вырашэнне ў гэтай справе.

— Што Белавежская гміна плануе рэалізаваць у будучыні?

— Я мару, каб у нашай гміне наладзіць сартаванне смецця. Добра было б знайсці прадпрыемства, якое згадзілася б бясплатна забіраць ад нашых жыхароў сартаваныя адкіды, на продажы якіх магло б зарабляць. Тыя сем’і, якія не хацелі б сартаваць смецця, крыху плацілі б за яго ўборку і гэта заахвочвала б да сартавання адкідаў.

— Вы вядзеце турыстычнае бюро ў Белавежы разам з мужам?

— Гэта муж з 2000 года вядзе турыстычнае бюро „Рысь”, а я яму толькі дапамагаю ў рабоце.

— Вашае бюро прымае экскурсіі, якія наведваюць Белавежу?

— Мы займаемся з экскурсіямі і прыватнымі асобамі. Знаходзім ім начлегі і афармляем харчаванне. Водзім турыстаў на Тэрыторыю строгай аховы БНП, як зараз называецца запаведнік, у музей і па турыстычных шляхах, якіх у нас многа. Калі яны хочуць больш свабодна ездзіць па пушчы, могуць браць у нас на пракат веласіпеды.

— Якія турысты найчасцей карыстаюцца вашымі паслугамі?

— Вясной прыязджае да нас найбольш польскіх турыстаў. Летам наведваюць нас немцы, іспанцы, аўстрыйцы, французы, італьянцы і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей.

— Якія госці найбольш патрабавальныя ў адносінах да прапанаваных паслуг?

— Галандцы і немцы ведаюць, што хочуць убачыць у Белавежскай пушчы і часта прыязджаюць паглядзець птушак або звяроў. Бывае, што калі ідуць яны ў запаведнік, шукаюць сабе асобнага экскурсавода, каб мог адказваць на іх пытанні. Больш агульна лесам цікавяцца італьянцы і іспанцы. Іспанскі кароль Хуан Карлас, які нядаўна наведаў Белавежу, быў на Тэрыторыі строгай аховы БНП і ў запаведніку зуброў.

— Ці сярод турыстаў трапляюцца жыхары Рэспублікі Беларусь?

— Раней не было, але ў мінулым годзе мы абслугоўвалі дзве групы з Беларусі. Было таксама некалькі груп з Расіі, Літвы, Славакіі.

— Чым цікавіліся беларускія турысты, якія наведалі Белавежскую пушчу з польскага боку?

— Былі гэта беларускія студэнты, якія моцна здзіўляліся, што могуць з картай свабодна хадзіць па шляхах Белавежскай пушчы і затрымлівацца, дзе схочуць, ну зразумела, апрача запаведніка. У беларускай частцы Белавежскай пушчы такія турыстычныя маршруты не дазволены. Падабаўся ім музей і Белавежскі нацыянальны парк, а начавалі яны ў сваіх палатках.

— Ці вашы госці цікавяцца жыццём мясцовых беларусаў і праваслаўем?

— Нашы турысты абавязкова хочуць зайсці ў белавежскую царкву і пытаюцца пра жыццё і веравызнанне мясцовага насельніцтва. Была ў нас нават група турыстаў, якія пажадалі наладзіць ім экскурсію па цэрквах Гайнаўскага павета. Я тлумачу гасцям, што мы — праваслаўныя беларусы, гасцінны народ і жывём у згодзе з іншымі веравызнаннямі і нацыянальнасцямі. Многія наведваюць рэгіянальны скансэн на акраіне Белавежы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Скідаем боты і таксама на жываце паўзем у пячору. У мініяцюрным эрэме пахне гісторыяй. Аўра святасці збівае з ног і панталыку. Мая суседка плача, другая ў натхненні моліцца за мір...

На аўтафуры ў манастыр

Пакуль пачнецца вячэрня, наведаем падзямельную царкву з цудоўнымі мошчамі святога Іава. Ідзем доўгімі калідорамі, размаляванымі суровымі постацямі манахаў. Каля храмаў вартуюць два міліцыянеры. Каб пакланіцца мошчам, трэба прыйсці раніцай, у назначаныя гадзіны. Зараз усё закрыта. Прыходзьце заўтра, — адпраўляюць без энергіі ў голасе ахоўнікі. Замест паслухацца загаду, мы прыліпаем да грамады цётак, якія што б там ні было хочуць дабрацца да мошчаў і напіраюць на пазалочаны ланцуг, якім загароджаны ўваход у царкоўку. Інтуіцыя нас не падводзіць.

Брама адчыняецца дзякуючы семінарыстам з Малдавіі, якія просяцца ў сярэдзіну, каб адспяваць акафіст святому. Разам упіраецца і сем цётак, у тым ліку і мы з Д. Міліцыянер не мае сілы адправіць нас за дзверы, адзін з іх рукой паказвае жэст: *а ну вас!* Маем уражанне, што роля ахоўнікаў тут дэкаратыўная, і так усім кіруе святы. У час пяяння міліцыянеры таксама жагнаюцца разам з семінарыстамі і паломнікамі.

Калі адслужыцца акафіст, нашы цёткі пруцца яшчэ ў пячору святога Іава. Уваход у яе напамінае вока ў небе і, каб туды дабрацца, трэба нырнуць усярэдзіну быццам дэльфін.

— Хутчэй-хутчэй! — паганяюць і нас міліцыянты.

Скідаем боты і таксама на жываце паўзем у пячору. У мініяцюрным эрэме пахне гісторыяй. Аўра святасці збівае з ног і панталыку. Мая суседка плача, другая ў натхненні моліцца за мір на ўсёй планеце, яшчэ нехта, скулены ў клубок, ляжыць пад скалой і лямантуе.

Я дзякую цёткам, што ўвапхнулі мяне ў пячору.

* * *

У Пачаеў прыязджаю ўжо чарговы раз, каб азірнуцца на часы дзяцінства. Тут, як у нашых вёсках, усе размаўляюць з усімі — значыць, мужчыны з мужчынамі, а жанчыны з жанчынамі. Часам здаецца, што бачу сваіх бабуль і прадзедаў са старых фотаздымкаў або літаратурных герояў XIX стагоддзя.

Пасля наведання святой пячоры мне хочацца невыносна спаць. Дзеля адпачынку сядаем на лавачцы і ўзіраемся на людзей, якія пераліваюцца хваляй. Найбольш падабаюцца святары і манахі з божай ласкі. Большасць з іх жыве на мінімальным стандарце — як іх прыхаджане.

— А вы, *матушкі*, адкуль самі будзеце? — пытае нас бабулька загледжаная ў неба. Калі кажам, што з Польшчы, у размову ўключаецца суседка бабулі. Успамінае, як год часу працавала нянькай у Лодзі. Добрыя ёй *паны* папалі, калі ішла ў царкву, намаўлялі каб маленькага Болюся з сабой забірала. A niech dzieciak zobaczy, jak ludzie się modlą! Пасля Болек прыязджаў да сваёй нянькі з бацькамі і з падаркамі.

— Пачастуйце *матушак* хоць просвірняй, — просіць бабуля загледжаная ў неба. Экс-няня ўтыкае ў нашы рукі посныя пернікі і просвірню з манастырскай печкі.

— Бярыце, бярыце, — намаўляюць нас бабулі, — мы ўсё дарма атрымоўваем.

Хоць нашы бабулькі ад галавы да ног у чорным, і ў іх руках кулькі з надпісам BOSS, яны радавітыя ўкраінкі з Валыні.

— Дажываем тут пры сваіх сынах, якія ў манастыры служаць, — кажуць пра сябе.

Калі нашы матушкі (усе жанчыны звяртаюцца да сябе „матушка") падымаюцца з месца, адна з іх просіць дапамогі. Тая што глядзіць у неба — невідучая.

* * *

Пішу пра ўсе людскія жэсты і бескарысную дапамогу ў дарозе, бо гэта яны ажыўляюць дух. І каб паправіць сабе настрой пасля непрыемных успамінаў. На другі дзень у манастыры сустрэне нас не надта хрысціянскае здарэнне. Манах з іранічнай усмешкай доўга дапытваецца — ці мы часам не каталікі. У запісцы за здароўе ўсіх іншаверцаў падкрэслівае алоўкам і значыць *кат*.! Хоць больш як каталікаў ненавідзіць ён вернікаў украінскай праваслаўнай царквы пад патранатам Кіева.

— Гэта антыхрысціяны, — кажа без ніякай дыстанцыі, ды совае ў нашы, абамлелыя ад уражання рукі, лістоўкі закрашаныя фанатызмам. Як высветліць, гэта адзіная дармовая лістоўка на ўкраінскай мове. Уся рэлігійна-гістарычная літаратура, якую раздаюць дарма, па-руску.

Хваля неталерантнасці прыйшла сюды пасля Аранжавай рэвалюцыі. (Пачаеў пад юрысдыкцыяй Масквы). Летам мінулага года, калі мы заявілі, што едзем у Пачаеў, бацюшка ў адной карпацкай мясціне параіў нам крайнюю асцярожнасць. Найлепш, — казаў, — прыкідвацца вам нямымі.

Праўда, на месцы ніхто нас не правяраў і не прасветліваў, хоць наш акцэнт здраджваў кірунак прыезду.

— Гайноўка? — пыталіся манахі.

— Гайноўка!

Праз момант мы мелі ўражанне, што Гайноўка таксама пад Маскоўскім патрыярхатам.

Ева Сцепанюк

Хворым дзецям

У Бельску-Падляшскім з 1998 года актыўна дзейнічае Згуртаванне прыяцеляў дзяцей „Gong", якое сваёй мэтай ставіць дапамогу хворым пухлінамі дзецям з бедных сем'яў Бельшчыны. Галоўнай крыніцай фінансавання дзейнасці згуртавання з'яўляюцца датацыі адміністрацыйных устаноў.

Гэтыя датацыі, як сказаў Пётр Мураўскі, старшыня згуртавання, не задавольваюць фінансавых патрэб падапечных. Грошы поўнасцю прызначаюцца на патрэбы хворых дзяцей (лякарствы, шпіталь, лячэбнае харчаванне, рэабілітацыйныя заезды, транспартныя сродкі).

Зараз згуртаванне мае пяцёра падапечных (найбольш было дванаццаць). Атрыманыя з датацый сродкі, агулам 9,5 тысяч зл., не дазваляюць на поўную рэфундацыю лячэбных выдаткаў сем'яў, дзе жыццёвыя абставіны патрабуюць пастаяннай прысутнасці аднаго з бацькоў пры дзіцяці. Лячэнне дзяцей звязана з частымі выездамі ў анкалагічныя клінікі. Дапамога сем'ям нераўнамерная, напрыклад, на агульную суму грашовай дапамогі ў 2004 годзе вартасцю ў амаль 34 тыс. зл., адна з сем'яў атрымала амаль дванаццаць тысяч, а іншая толькі трэць тысячы. З-за хваробы дзеці вучацца дома, яны ізаляваныя ад асяроддзя, іх жыццё падпарадкавана тэрмінам падачы лекаў і г.д.

Управа згуртавання ў прынцыпе сустракаецца раз у квартал, калі абставіны не патрабуюць часцейшых кантактаў. Управа галоўным чынам разглядае справы грашовай дапамогі падапечным і іх сем'ям.

Міхал Мінцэвіч

Пажарнікі

28 мая г.г. у Гайнаўцы будуць святкаваць Дзень пажарніка. Напомнім, якім быў 2005 год для гайнаўскіх пажарнікаў.

У мінулым годзе пажарныя каманды ездзілі на інтэрвенцыі ў сярэднім кожныя 11,5 гадзіны. Выклікалі іх больш за 760 разоў, у тым ліку 400 разоў гасіць пажары. Мінулы год, на думку гайнаўскіх пажарнікаў, не быў вельмі цяжкі. Пажарнікі ездзілі таксама да дарожна-транспартных здарэнняў, а тады аказвалі медычную дапамогу, ліквідавалі гнёзды восаў і шэршняў, знімалі катоў з дрэў. Ранняй вясной гасілі 12-15 пажараў кожны дзень. Некаторыя сяляне падпальвалі сухія травы на пашах і лугах.

Аднак пажары і стыхійныя няшчасці гэта не адзіныя пагрозы для жыхароў Гайнаўскага павета. Чыгункай возяць небяспечныя субстанцыі: газы, алеі, аўтол, ацэтылен, аміяк — больш за 300 тысяч тон хімікатаў у год. У Гайнаўцы ды ў Нараўчанскай гміне ёсць прадпрыемствы, якія захоўваюць небяспечныя рэчывы на складах. Пажарнікі часта іх кантралююць.

Пажарная ахова ў Гайнаўцы здабывае спецыялістычнае медыцынскае абсталяванне, каб несці дапамогу падчас пажараў і ў выпадку няшчасных дарожна-транспартных здарэнняў. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Пераможцы — дашкольнікі з Садка н-р 3 у Гайнаўцы з выхавацелькай Верай Масайла

Спявалі на сваіх мовах

У самаўрадавае польска-беларускае прадшколле н-р 14 у Беластоку, што па Алеі Юзафа Пілсудскага, прыехалі дзеці не толькі з іншых садкоў Беластока, а нават і з іншых гарадоў! Яшчэ і з Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі, а нават з Пуньска. З Пуньска прыехалі дзеткі, якія вывучаюць у садку таксама сваю родную мову: у іх яна літоўская. Усе дзеці прыехалі на конкурс роднай песні, які ў наступным годзе, як ім абяцалі, стане фестывалем, значыць, вялікім, багатым конкурсам, і з яшчэ файнейшымі ўзнагародамі для найлепшых. А ўсе былі вельмі добрымі ў гэты дзень, — усе, хто выступаў са сваімі песнямі, хто адзін адважыўся стаць за мікрафонам, а хто разам з сябрамі — тады і адважней, і весялей, і гучнейшая наша песня!

З роднага садка н-р 14 выступіў Паўлік Гаінскі з сумнай песняй пра бяздомнага шэрага худзенькага коціка, які мокне на дажджы, але, гэта, была толькі другая сумная песня, пасля песні Мартусі Цываюк пра кульгавага сабачку Чапу („Цапу!"). Былі і зусім смешныя песенькі, як „Чыкі-брыкі" Міхася Бабіка (журы зусім не ведала ў чым справа), і „Вясёлыя гусі" Рафала Кулакоўскага, і пра бульбачку („Земляныя яблыкі") Якуба Койлы, Арыядны Бакер, Дамінікі Благушэўскай, Паўліны Дацюк, Даркі Рудчук і Агнешкі Зданоўскай, былі і народныя як з Садка н-р 55 пра дзяўчат, што пасеялі лён, якую заспявалі Клава Лук'янюк, Грэсь Васілюк, Магда Алексяюк, Агата Абрамовіч, Мартына Урбан і Патрыцыя Цыльвік... Мартына Панасюк і Караліна Яновіч з Садка н-р 1 у Гайнаўцы заспявалі „Купалінку", Грышка Гіншт, Давід Дмітрук, Гося Бляхаж і Габрыся Кот — „Чэраз рэчаньку", а Наталька Дзюбанос — „Ой, пры лузе ў даліне" ды рабіла ім здымкі. А Юля Гадоўская была „чараўніцай"! Маленькія дзяўчаняткі-кураняткі з Садка н-р 55 — Анютка Куляга, Сільвія Раманоўская, Беата Каменская, Оля Лавіцкая, Наталля Кандзеля і Каміля Ярашэвіч станцавалі і адспявалі адпаведны „птушыны" танец. А дашкольнікі з Садка н-р 3 у Гайнаўцы — Гаўрылка Сурэль, Кшысь Грыгарук, Оля Іванюк, Аня Чыквін, Эва Галёнка і Аня Раманюк вельмі бадзёра адспявалі тры песні пра катоў і ўзялі самую важную ўзнагароду — Гран-пры! Іншыя ўзнагароды гэта III месца Садку н-р 9 у Бельску-Падляшскім, дуэту Насці Мураўскай і Артуру Макоўскаму з Пуньска, II — Садку н-р 14 за згаданыя „Земляныя яблыкі" ды Дамініцы Малашкевіч і Кшысю Іванюку з Садка н-р 41 у Беластоку ды I — хлопчыкам і дзяўчаткам з Пуньска. Выступіла таксама адна дзяўчынка, якую рыхтавала яе мама — Габрыся Курцэвіч. Усім выступленні ўдаліся на славу, а сам старшыня журы — Ежы Томзік — сказаў, што вуха ўва ўсіх добрае. Значыць, чакаць будзем фестывалю і новых песень! І яшчэ папрацуем!

Тэкст і фота Міры Лукшы

Грэсь Васілюк

Дамініка Малашкевіч

Кшысь Іванюк

Дарагая Рэдакцыя!

Напачатку мы сардэчна Вас вітаем. Мы, разам з сяброўкай, вельмі любім чытаць Ваш тыднёвік „Ніву", асабліва вершы, якія Вы публікуеце на старонках „Зоркі". Мы падумалі, што можам прапанаваць і наш верш.

Айчына...
Я жыву ў пушчы,
на роднай зямлі.
Я яе кахаю,
як сям'ю сваю.
Зямелька мая,
гэта маці.
Але што будзе,
калі маці не стане?
Мая айчына,
маё каханне,
яно мне астане...

Наталля і Івона, вучаніцы III кл. Публічнай гімназіі ў Дубінах

Ад рэдакцыі: Прывітанне, дзяўчаты! Вельмі складны і цікавы Ваш верш. Заўсёды, калі дасылаеце нам калектыўныя творы, просім каб Вы паспрабавалі пісаць індывідуальна. Наталля і Івона — дашліце свае прозвішчы. Тут мы падрыхтуем Вам паэтычныя зборнікі. І дасканальце свае ўмеласці — пішыце нам!

Зорка

Галерэя дэкламатараў — НАРАЎКА 2006

Андрэй Галёнка

Ганна Піскорская

Ігар Фралоў

Дамініка Лапцеў

Тры Паўліны і Паўл

Экскурсія і дыскатэка — гэта амаль сінонімы ў галовах гімназістаў. Карацей: ніхто з нашых сяброў не мог уявіць сабе турыстычнага падарожжа без танцаў. Тады найчасцей лопаюць старыя і завязваюцца новыя каханні. Ну і паказаць трэба ж усе новыя сукенкі і блузачкі, якіх панаўпіхалі поўныя рукзакі дзяўчаты. Паўліна Ш. прыдбала зялёны парык, каб „рэзаць" спевака Міхала Віснеўскага. На здзіў сяброў, якіх шакіраваў новы фрыз нашай *xini*, Паўліна Ш. адказвала перакручаным тэкстам куміра: *Не, гэта не сон — гэта мая маладзенькая галоўка!*

Ліза Крот і Ян Дубаля — апекуны групы — палічылі, што толькі дзякуючы дыскатэкам і ўсялякім гульням ім пашанцуе ўтрымаць акуратнасць і добры настрой у групе. Чым больш танцаў і гумару, — меркавалі яны, — тым менш інфантыльных гульняў з зубной пастай і жвачкамі. Праўда, у пачатку падарожжа ім ледзь пашанцавала спыніць дурную хвалю. Ужо на першым прыпынку гімназісты тэлефанавалі сваім бацькам і знаёмым ды інфармавалі пра кожны свой крок: куды даехалі, як смакавалі ім бутэрброды ды з кім сядзяць у аўтобусе.

Ян Дубаля не любіў тэлефоннага шоу.

— Паслухайце, мілыя, — настаўнік матэматыкі іранічна заўсміхаўся, — я прапаную вашай увазе адну справу. Або будзем усю дарогу званіць і інфармаваць увесь свет пра дробязі, або спынім усе танцы. Гімназісты ведалі, што Ян Дубаля не пераносіць культу машын і найахвотней, як гэта робяць у Канадзе, цалкам забараніў бы прыносіць у школу мабільнікі і ўсялякія электронныя цацкі.

— Выбірайце самі, — матэматык развёў рукамі, — або танцы, або тэлефонны транс?

— Танцы, танцы! — радасна ўсклікнулі дзяўчаты.

У грамадзе дамовіліся толькі на адзін тэлефон у дзень да бацькоў. Апошнім, г.зн. сябрам, цёцям і нарачоным трэба было выслаць паштоўкі. Дзеля апошняй справы Ліза Крот прыдумала конкурс на самыя арыгінальныя пажаданні. Ну, каб не пісалі пад адну лінейку...

Першую ноч гімназісты начавалі ў люблінскай гасцініцы „Лотаць". Ужо пасля вячэры пачаліся танцы. На дыскатэку першымі з'явіліся апекуны. Ліза Крот і Ян Дубаля танчылі разам з моладдзю ўвесь вечар. Значыць, яны адны з сабой у пары.

(працяг будзе)

Арабінка

Дзьмухавец

Шчодра прыгравала сонейка. Вясновая цеплыня разлілася па ўсім наваколлі. Усюды з зямлі прабівалася маладая зялёная траўка. Яна прагна цягнулася да сонца, набіралася моцы. Сады рыхтаваліся да цвіцення. Паміж галінак дрэў гуляў-шамацеў вецер-свавольнік. Ён радасна распавядаў маладым лісточкам пра заморскія краіны, дзе яму давялося пабываць, пра дзівосныя дрэвы, што ўбачыў там.

Ніхто не заўважыў, як на двары каля плота паказаліся зазубраныя лісточкі дзьмухаўца. А яшчэ праз дзень-два з'явілася жоўтая галоўка. Малады дзьмухавец рос не па днях, а па гадзінах. Ён цікавіўся ўсім, што адбывалася на двары.

„Хто гэта? Напэўна, нейкі страшны звер! А што за пачвары, ціўкаючы, бягуць за ім?" — падумаў дзьмухавец, калі аднойчы ўбачыў недалёка квактуху з куранятамі. Але калі чубатчына сямейка падышла бліжэй, зразумеў, што курыца зусім не страшная, а куранятыя такія пацешныя. Нават нечым падобныя на яго, дзьмухаўца. Ён пасмялеў, перастаў баяцца насельнікаў двара. Завязваў размову з імі ўсё часцей і часцей. Хутка ўсе з ім пасябравалі.

Ды аднойчы з дзьмухаўцам нешта здарылася. Ён адчуваў гэта, але не бачыў. Толькі сябры заўважылі: ён пабялеў, распушыўся. І калі мацней дзьмуў ветрык, з яго галавы зляталі лёгкія белыя пушынкі.

У той дзень да яго падышлі дзеці. Адна дзяўчынка, смеючыся, сарвала яго. Дзеці пачалі дзьмухаць на галоўку. Здзьмулі пушынкі-насенне, а непатрэбную і ўжо непрыгожую кветку выкінулі. Але дзьмухавец чамусьці не шкадаваў, што так здарылася. Ён ведаў, што наступнай вясною каля плота вырасце многа дзьмухаўцоў-дзетак, такіх жа цікаўных, як і ён сам.

Юля Новік, Салігорск

Вершы Віктара Шведа

Перапіска

На сценах з раскошай
Пішуць без патрэб:
„Я не маю грошай
На звычайны хлеб".

Нехта знерваваны
Дапісаць паспеў:
„А на спрэй, каханы,
Грошыкі ты меў?"

Каштанавае дрэва

Запытаў Сярожу
Біёлаг Янка Плева:
— Па чым пазнаць мы можам
Каштанавае дрэва?

— Вядома, па каштанах.
— А калі іх не мае?
Адказ быў нечаканы:
— Тады я пачакаю.

Польска-беларуская крыжаванка № 21



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 17: Аснова, склеп, з'ява, сума, пік, ты, вясёлка, лодка, гусі, заліў, вусны, сабака, каратэ. Ньюс, свята, вы, нуда, сук, сяліба, вус, мёдзік, скалка, катар, ліпа, пік, кай, кабарэ.

Ягаднікі жылі ў страху

Людзям з Ягаднік да вайны цяжка было гаспадарыць. На лугах побач вёскі часта стаяла вада і вымакала трава. Збожжа сеялі на вышэй распаложаных у напрамку Дубіч-Царкоўных палях. Аднак гэтыя землі былі дрэннай якасці і вырошчвалі на іх у галоўным жыта і авёс. Умовы гаспадарання змяніліся ў выніку ліквідацыі цераспалосіцы і меліярацыі зямель, праведзеных пасля вайны. Аднак развіццё сельскай гаспадаркі тады сталі тармозіць вялікія падаткі і абавязковыя пастаўкі харчавання, якія з'ядалі прыбытак ад сельскагаспадарчай вытворчасці.

— Пры санацыі бяда ў нас была такая, што мой татуля хадзіў у пасталах, а мама пашыла сабе башмачкі. Мы не былі ў змозе купіць чобаты, у якіх хадзілі тады жыхары больш заможных вёсак. Пасля дажджоў на лугах вакол вёскі стаяла вада. Бывала, што ў час сенакосаў сена плавала. Тут расла неядомая трава „кастэрэва", а іншая, паміж ёю, вымакала і не ставала корму каровам, — кажа Сяргей Іванюк і паказвае на луг насупраць ягонага панадворка. — Збожжа найчасцей малолі ў жорнах, але ў вёсцы быў ужо адзін млын, у якім малолі мы збожжа пад Ражджаство і Вялікдзень.

Іншы мой суразмоўца тлумачыць, што перад вайной гаспадарыў ён на полі, падзеленым на тры часткі.

— На дзвюх частках зямлі мы сеялі збожжа або садзілі бульбу, а трэцяя частка поля адпачывала. Калі ў гаспадара быў участак поля велічынёю ў 14-15 гектараў, то палоскі не былі вельмі вузкімі. Аднак у тых, што гаспадарылі на „чэтвертухах" (чацвёртая частка ўчастка), кавалкі палёў былі ўжо надта вузкімі і апрацоўка іх была складаная, — тлумачыць Фёдар Джэга.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Фёдар Джэга

Спадарожнік страх

У час вайны жыхары Ягаднік жылі ў пастаянным страху перад немцамі і партызанамі, якія часта наведвалі вёску.

— У нашу вёску немцы перасялілі жыхароў прыпушчанскіх Пасечнікаў і Лазіц разам з будынкамі, — гаворыць спадар Сяргей.

— У час вайны ў вёсцы двойчы ўспыхнуў пажар. Раз немец стрэліў у гумно і ад кулі яно загарэлася. Вецер быў настолькі моцны, што немагчыма было спыніць агонь. Згарэла тады 12 клуняў распаложаных побач сябе. У нашым гумне згарэлі воз і частка сена, — успамінае Фёдар Джэга. — Другі раз клуня загарэлася з другога боку вёскі ад абстрэлу з самалёта і разам з ёю згарэлі яшчэ некалькі суседніх гумнаў. Хаты і хлявы асталіся цэлымі, бо стаялі далёка ад клуняў.

Людзі з Ягаднік дапамагалі партызанам, якія прыходзілі ў іх вёску, а бывала, што пад прымусам аддавалі ім харчы. Пасля вайны вёску наведвалі банды, якія выходзілі з лесу на рабунак.

— У нашую хату прыйшлі бандыты з вінтоўкамі, былі апранутыя ў звычайную вопратку і размаўлялі па-польску. Загадалі аддаць харчы, чаравікі, вопратку і ўсё забралі, — гаворыць Фёдар Джэга. — Партызаны ў час вайны вялі сябе інакш. Дзялілі яны харчы папалам і адну частку бралі з сабой.

— Мой татуля зрабіў у каморы тайнік, дзе мы хавалі мяса, харчы, кажухі і вопратку ад партызан, немцаў і бандытаў. Ніхто з іх не знайшоў нашай схованкі, якая існуе па сённяшні дзень, — кажа спадар Сяргей і вядзе мяне ў камору старой хаты, каб паказаць бацькавае вынаходства.

Загінулі побач Пухалаў

Мае суразмоўцы з жалем успамінаюць гаспадароў з Ягаднік, якія разам з іншымі вазакамі загінулі каля Пухалаў-Старых з рук польскага падпольнага атрада.

— Каля Пухалаў былі забіты нашы гаспадары Нічыпар Лаўрыновіч, Ваня Юшчук і Іван Лаўрыновіч, якіх забралі з Лазіцаў разам з вазамі. Я ездзіў разам са святаром са Старога Корніна на месца іх пахавання каля Пухалаў, — гаворыць Сяргей Іванюк. — Мой брат Рыгор таксама апынуўся тады разам з іншымі вазакамі ў Лазіцах. Аднак удалося яму схавацца пад клуню. Конік быў у нас слабенькі і таму пакінулі яго разам з возам. Перачакаўшы небяспеку ў схованцы, брат вярнуўся дамоў.

— Мой бацька Мікола таксама быў затрыманы ў Лазіцах. Аднак быў ён тады старэнькі і пусцілі яго дамоў, — успамінае Фёдар Джэга.

Лепшае гаспадаранне

Гаспадаранне ў Ягадніках палепшылася пасля вайны, калі ліквідавалі цераспалосіцу.

— Камасацыя пачалася яшчэ перад вайной. Тады вызначылі вялікія ўчасткі поля і абазначылі іх стоўбікамі. Аднак мы не паспелі перайсці на новыя землі, бо пачалася нямецка-польская вайна, — кажа Фёдар Джэга. — Землямеры, якія ў 1945 годзе прыехалі ліквідаваць цераспалосіцу, знайшлі стоўбікі закапаныя ў зямлі. Там, дзе іх не было, укапалі новыя, згодна з даваеннымі планамі. Калі мы перайшлі на новае поле, зрабілі ў нас меліярацыю і стала нам намнога лягчэй гаспадарыць.

Разам з камасацыяй палёў жыхарам Ягаднік прапанавалася засноўваць хутары побач вёскі. Тыя гаспадары, якія перабраліся на пастаяннае жыхарства па-за вёскай, атрымлівалі больш поля, чым мелі раней і іх зямля была распаложаная вакол панадворкаў.

— Людзі ў вёсцы жылі тады пасяброўску. Калі трэба было перавозіць дамы і гаспадарчыя будынкі на новае месца, суседзі, якія аставаліся жыць у сяле, памагалі ў перавозцы, — гаворыць Фёдар Джэга.

Спакусіліся на „лепшае" жыццё

Некалькі сем'яў з Ягаднік паверыла ў савецкую прапаганду і рашылася выехаць за ўсходнюю мяжу.

— Тыя, што рашыліся выехаць у Савецкі Саюз, гаварылі, што будуць там есці блінчыкі і вінаград. Я ўсім гаварыў, каб не выязджалі з Ягаднік. Тлумачыў я вяскоўцам, што пасля чатырохгадовай вайны ўсё ў Расіі знішчанае. Калі казалі, што дадуць на новым месцы харчаванне і работу, я напамінаў пра ваенныя знішчэнні, — кажа Фёдар Джэга. — Тыя, што рашыліся выехаць у Савецкі Саюз, забралі з сабой увесь дабытак, бо можна было браць нават кароў і свіней.

— У Савецкі Саюз выязджалі нашы равеснікі і мы іх праводзілі на чыгуначны вакзал у Гайнаўку. Сядзелі яны ў вагонах задаволеныя, што выязджаюць на лепшае жыццё, — гаворыць жонка Фёдара — Вольга Джэга. — У Савецкім Саюзе загадалі нашым вяскоўцам выйсці з вагонаў. Іх поезд з усім дабыткам ад'ехаў, а нашы суседзі асталіся на перонах. Пасля расказвалі нам, што сталі адчайна крычаць і думалі, што ўчуюць іх у Польшчы. Застаўшыся без дабытку, які забралі з дому, трапілі ў калгасы. Спачатку не дазвалялі ім прыехаць у Польшчу, а пасля баяліся яны расказваць пра жыццё ў Расіі.

Падаткі і абавязковыя пастаўкі

Хаця пасля вайны палепшыліся ўмовы гаспадарання, жыхары Ягаднік не ўспамінаюць гэты перыяд станоўча. Абавязковыя пастаўкі сельскагаспадарчых прадуктаў у гарады і вялікія падаткі тармозілі развіццё гаспадарак.

— Мы мусілі плаціць вялікія падаткі і пастаўлялі ў горад за невялікую плату харчпрадукты. У майго бацькі было 11 гектараў зямлі і вымушаны ён быў пастаўляць штогод 300 кілаграмаў мяса, 800 кілаграмаў збожжа і 1 200 кілаграмаў бульбы. Хаця за гэтыя прадукты крыху плацілі, то выручаных грошай не хапала, каб заплаціць падатак. А трэба было яшчэ зарабіць на жыццё, — кажа спадар Фёдар.

— Амаль з усіх дамоў людзі ездзілі на заробкі ў Варшаву, аднаўляць горад. Мой бацька таксама туды ездзіў і зарабляў грошы на ўтрыманне сям'і, — успамінае спадар Іванюк.

Чыноўнікі паспрабавалі арганізаваць у Ягадніках калгас, але не было ахвотных уступаць у яго.

— Тыя, што маглі б сарганізаваць калгас, выехалі ў Расію, а іншыя не спяшаліся да калектыўнага гаспадарання, — тлумачыць Фёдар Джэга.

— Аднак тады ў вёсцы жылося весялей, чым цяпер. Мы любілі многа спяваць і сустракаліся часта ў сваёй маладзёжнай кампаніі. Праўда, не было грошай, каб купіць вопратку і трэба было ў лесе зарабляць на нейкую хустачку, — успамінае Вольга Джэга.

Сяргей Іванюк кажа, што жанчыны ў яго сям'і мелі многа працы дома. Мусілі яны прасці, ткаць і мала часу заставалася на адпачынак.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Ягадніках драўляныя крыжы ставіліся на панадворках дзеля аховы ад хвароб і нячыстых сіл

Жанглёрка законамі?

Калі мы здавалі ў друк гэты нумар „Нівы", Крымінальнае аддзяленне Раённага суда ў Беластоку абвяшчала прыгавор па справе парушэння закону аб рахункаводстве Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва" ў перыядзе 2001 год — першы квартал 2003 года. На судовым пасяджэнні, якое папярэднічала абвяшчэнню прыгавора, пракурор патрабаваў восем месяцаў умоўнага зняволення з адтэрміноўкай на два гады і 2,1 тыс. зл. штрафу для былога старшыні Праграмнай рады Яўгена М., а ў дачыненні да глаўбуха Марыі П. — адпаведна — год умоўнага зняволення з адтэрміноўкай на тры гады і 3 тыс. зл. штрафу. У дачыненні да астатніх дзевяці абвінавачаных падтрымаў ён ранейшае заключэнне, а з якім не згадзіліся самі абвінавачаныя, аб умоўным спыненні справы на год і штрафе велічынёю па 500 зл. кожнаму.

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Паказанні дае Івона Гродзка (супрацоўніца былога Міністэрства культуры)

Назіральнікі за працэсам былі ўпэўненыя, што на гэтым пасяджэнні будуць заслуханы выключна паказанні сведкі Івоны Гродзкай — супрацоўніцы Дэпартамента веравызнанняў ды нацыянальных і этнічных меншасцей Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якая раней працавала ў Міністэрстве культуры, з якога пераведзены быў яе дэпартамент. Крок за крокам тлумачыла яна прычыны, якія прымушалі Праграмную раду „Нівы" прымаць рашэнні, якія сталі аб'ектам „зацікаўлення" Найвышэйшай кантрольнай палаты (НКП) і пракуратуры.

Пасля допытаў, якія цягнуліся больш за гадзіну, адвакацкі бок патрабаваў, між іншым, заслухаць рэкамендацыю другога эксперта па рахункаводстве, які мог бы выказаць незалежнае меркаванне, чым тое, якое прадставіла на адным з пасяджэнняў Анна Андрэйчук, вызначаная пракурорам. Больш таго, адвакаты прапанавалі выклікаць у якасці сведкі Антоні Янухту — тагачаснага дырэктара Беластоцкай дэлегатуры НКП, якая справу тыднёвіка накіравала ў пракуратуру.

Старшыня судовай калегіі Кшыштаф Казлоўскі выразна здзівіўся. Не скрываў ён, што разлічваў закончыць справу ў той жа дзень. Пасля пятнаццаціхвіліннага перапынку адхіліў ён патрабаванне заслухаць рэкамендацыю другога эксперта, паколькі тлумачэнні Анны Андрэйчук былі яму „ясныя, поўныя, не выклікаюць засцярог і яе рэкамендацыі будуць падвяргацца ацэнцы суда". Так сама паставіўся ён да другой прапановы, паколькі меркаванні Антоні Янухты „не маюць значэння". У спешным парадку дайшло тады да завяршальных выступленняў пракурорскага і адвакацкага бакоў. Пракурор гаварыў:

— Цяжка не прызнаць, што завышаны тыраж гэта памылка. Гэта свядомае і мэтанакіраванае дзеянне дзеля атрымання датацыі.

Быў ён упэўнены:

— Калі не прыкладзем мінімальных намаганняў, каб уся рахункаводчая працэдура праводзілася ў адпаведнасці з законам і згаджаемся, каб у нейкі спосаб сітуацыя выйшла з-пад кантролю, тады можна гаварыць аб магчымым няўмысным намеры. Ніводзін з членаў управы тыднёвіка не быў настолькі дапытлівы, каб пазнаёміцца з законамі ў гэтай галіне. Выказваючы мінімальную стараннасць, трэба было азнаёміцца з абавязваючымі правіламі.

Пракурор звярнуў таксама ўвагу на выношаны ў ходзе судовага разбору матыў несуладдзя законаў і прыярытэтнай мэты (як перад гэтым гаварыла Івона Гродзкая, вынікаючай з прычыны склаўшайся сітуацыі), якой было і ёсць бесперабойнае і тэрміновае выдаванне тыднёвіка:

— На маю думку, нельга было дзейнічаць нязгодна з законам. Выхад з сітуацыі быў — гэта анексы. Аднак „Ніва" імі не карысталася. Праўду кажучы, спадарыня Гродзка сказала, што мала хто гэтым карыстаўся, аднак у першым выказванні сцвердзіла, што такая магчымасць была.

Паводле меркаванняў пракурора, у гэтай справе малаістотным з'яўляецца той факт, што падобныя або такія ж, прытым на большыя сумы, абвінавачанні былі вынесены друкаваным выданням Згуртавання літоўцаў Польшчы і Саюза ўкраінцаў:

— Гэта праўда, што ніхто не атрымаў выгады. Аднак трэба памятаць, што гэта публічныя грошы, кожнага з нас, а не нейкага там міністра культуры, ці цяпер міністра ўнутраных спраў. Па фармальных прызнаках абвінавачаныя здзейснілі прад'яўленае ім злачынства.

Адвакацкі бок прапанаваў апраўдаць (!) усіх абвінавачаных.

— Абвінавачаным можа быць толькі той, хто поўнасцю свядома запаўняе дакументы неадпаведна законам, менавіта тады яго віна ў праве. Суду трэба даказаць віну ў праве, але не лік памылак аб гэтым сведчыць. Нельга гаварыць аб парушэнні закону аб рахункаводстве і яе свядомым парушэнні.

Адзін з адвакатаў адзначыў:

— Можна ў даным выпадку гаварыць пра цывільную, службовую адказнасць, але не крымінальную. У абвінаваўчым акце пракуратура прымяніла калектыўную адказнасць. Не вызначыла яна закідаў паасобным абвінавачаным. Бухгалтарка лічыла, што такога тыпу арганізацыя не павінна весці такую бухгалтэрыю як на прадпрыемстве. Закон прадбачвае г.зв. спрошчанае рахункаводства.

Спасылаючыся на паказанні Івоны Гродзкай, адвакат паўтарыў, што лікі, якія падаваліся ў прашэннях аб датацыю, не мелі істотнага значэння пры яе размеркаванні, а велічыні запрошваных датацый ва ўсіх прашэннях былі завышаныя, але не трактаваліся яны як спроба выманачання грошай:

— Гэтыя людзі не заслужылі на тое, каб так іх трактаваць, кіраваць справу ў суд. Не можа быць мовы аб змарнаванні ці прысабечанні публічных грошай.

Далей гаварыў:

— Аб прыпыненні справы не можа быць мовы, бо ў святле закону ўсе абвінавачаныя вызваленыя ад крымінальнай адказнасці.

Адвакаты адзначалі таксама:

— Абвінаваўчы акт гэта свайго роду жанглёрка законамі, якія адны і тыя ж учынкі і абставіны дазваляюць бачыць з розных бакоў. Не кожны забаронены ўчынак гэта злачынства.

Самі абвінавачаныя таксама выказаліся за сваё апраўданне. А Яўген М. падзяліўся сваім здзіўленнем:

— Не ведаю адкуль столькі злой волі ў дачыненні да „Нівы" з боку НКП і пракуратуры. Я не ўчыніў ніякага злачынства і ў мяне не было такога намеру.

У сваю чаргу цяперашні галоўны рэдактар і заадно старшыня Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" Яўген В. сказаў:

— Гэта справа важная не толькі для меншасных, але таксама для ўсіх няўрадавых арганізацый. Аб гэтым судовым працэсе гаворыць увесь свет.

Раіна Стэфанчук

Творы з-над Нарвы і Нёмана

У адзін з сусветных дзён кнігі, якія ў Беластоку праводзіліся пару дзён пазней з нагоды праваслаўнага Вялікадня і ў які ўключыліся кнігарні, дамы культуры і бібліятэкі, таксама і Падляшская ваяводская бібліятэка далучылася да святкавання. 26 красавіка ўручана была Узнагарода срэбнай ружы за 2005 год — атрымалі яе Люцына Шабётка, дырэктарка Публічнай бібліятэкі ў Саколцы і яе калектыў. Увечары праводзілася прамоцыя зборнікаў *Гнёзды слоў, словы гнёзд* ды *Вершаў з-над Нарвы і Нёмана*. Сустрэчу вёў журналіст Радыё Беласток і паэт Веслаў Шыманскі. Сабраных прывабіла і тое, што мелі быць прысутныя аўтары твораў змешчаных у зборніку, асабліва з Гродзеншчыны. Падобна, як на апошнюю канферэнцыю, прыехаць з Гродзеншчыны ніхто не змог (доўгачаканы Юрка Голуб вельмі моцна захварэў). Чытала вершы па-польску акцёрка беластоцкага драмтэатра Юстына Гадлеўская-Кручкоўская, а па-беларуску перакладчыкі Віктар Швед і Міра Лукша. Большы час сустрэчы заняла прыехаўшая з Варшавы паэтэса Крыстына Гадлеўская, аўтарка знакамітых вершаў і вельмі арыгінальная асоба. З іншых аўтараў, змешчаных у анталогіі, можна было ўбачыць ціхмяныя постаці знакамітых паэтэс — Малгажату Дабкоўскую і Эву Міхальскую — аўтарак, якія самі не ўмеюць „прамавацца", якія аж здзівіліся, што апынуліся ў зборніку, з якога рэдактарскія нажніцы выразалі творы каля 20 аўтараў малодшага пакалення з абодвух бакоў мяжы, сярод іх такіх знакамітых, раней вартых узнагарод м.інш. імя Веслава Казанэцкага як хоць бы Кшыштаф Гедройц, Пятро Брысач, Кацярына Эва Здановіч, Марта Цывінская (адна з найлепшых аўтарак франкафонскага арэалу), Ірэна Стэльмах ці Анатоль Брусевіч або Юры Гумянюк, член ПЭН-цэнтра. Мабыць, не хапіла еўрасаюзных сродкаў. А, можа, якраз за іх творы выдавец не хацеў „браць адказнасці", да чаго забавязаўся на вокладцы зборніка?

Вялікі размах брала таксама другая анталогія твораў для дзяцей. Атрымала яна канчаткова загаловак *Вершы з-над Нарвы і Нёмана*, паколькі прозу рэдактар адкінуў (апрача маленькіх замалёвак Малгажаты Шышка-Кондэй). Упрыгожылі кніжачку малюнкі дзяцей, а чытаць яе можна пачынаючы з двух бакоў — з аднаго па-польску, з другога — па-беларуску. Сярод вядомых беларускіх аўтараў, якія паходзілі з Гродзеншчыны — святой памяці Ларыса Геніюш і Сяргей Новік-Пяюн. Іншыя аўтары вершаў, якія напэўна спадабаюцца дзецям з абодвух бакоў мяжы — Сяргей Чыгрын, Юзэфа Драздоўская, Уладзімір Філіповіч, Ян Леанчук (складваў быў вершы з малымі сваімі сынамі, цяпер ужо дарослымі), Насця Місюкевіч, Таццяна Сучкова, Зофія Олек-Рэдлярска, Зофія Помян-Пентка, Ядвіга Салінская, Анджэй Выдмінскі і Віктар Швед, які выбраў вершы, якія былі яму даспадобы і пераклаў іх — з польскай на беларускую мову, а з беларускай — на польскую. Абмяжоўвала яго толькі адно — аб'ём кнігі. Мабыць, будуць наступныя зборнікі, як абяцае рэдактар і дырэктар Ян Леанчук. **(лук)**

Па моладзевых захапленнях можна ацаніць, як праз пару дзесяткаў гадоў глянуць на свет людзі, светапогляд якіх фармаваўся пад тым ці іншым музычным уплывам...

http://thekrok.com

Кожны час родзіць сваіх кумiраў. Звычайна сярод моладзі кумірамі становяцца музычныя гурты і асобныя выканаўцы. Гэта зразумела, бо з'яўленне на публіцы і выкананне добрай песні ўжо ставіць чалавека крыху вышэй за тых, хто таксама любіць музыку, але не навучыўся добра спяваць. Увогуле, па моладзевых музычных захапленнях можна даваць некаторую ацэнку таго, як праз пару дзесяткаў гадоў будуць глядзець на свет людзі, светапогляд якіх фармаваўся пад тым ці іншым музычным уплывам.

Дзякуючы Інтэрнэту пазнаёміцца, хаця б віртуальна, з дзейнасцю разнастайных музычных гуртоў не так складана. Тым больш, што ў Беларусі сусветнае павуцінне часцяком ці не адзіны спосаб, каб пра цябе даведаліся іншыя. Менавіта такім чынам я пазнаёміўся з рок-гуртом „Крок", а дакладней з яго сайтам у Інтэрнэце, які сваім нечаканым афармленнем прыцягнуў да сябе ўвагу.

Калі выйсці на адрас http://thekrok.com, то на маніторы камп'ютэра адкрыецца выяўленне фотаздымка нейкай музычнай групы, якая, хутчэй за ўсё, праводзіць рэпетыцыю. Больш няма нічога, акрамя маленькіх пазначэнняў пад здымкам, якія ўказваюць на выйсці да беларускамоўнай і рускамоўнай версій сайта. Дарэчы, здымак займае толькі невялікае месца ў сярэдзіне — усё навокал чорнае. Падобным чынам зробленая кожная старонка цэлага сайта. На нібыта мятым амаль белым аркушы паперы ў сярэдзіне чорнага выяўлення размешчаны выйсці да рубрык (з левага боку) і асноўны тэкст і фотаздымкі (з правага). Трэба адзначыць, што чорны колер гэта свайго роду сімвал рока як музычнай плыні.

Пасля выйсця на адпаведную моўную версію нам адразу адкрываецца рубрыка „Навіны". Зразумела, усе паведамленні тычацца ў асноўным „Крока", ягоных песень і канцэртаў, а таксама паведамляецца дзе і як можна набыць яго дэбютны дыск. Прыемна, што „Навіны" абнаўляюцца рэгулярна, бо маюцца звесткі не толькі аб прайшоўшых, але і будучых падзеях.

Усе выйсці да іншых рубрык уяўляюць сабой „неахайна" зробленыя пад рознымі вуглямі надпісы, дзе перамешаны мовы і алфавіты. „Гісторыя krok", „Who is who?", „Razмовы" паказваюць, як лёгка прыцягваецца ўвагу інтэрнэт-карыстальніка падобным крэатывам. Што ж датычыцца ўласна гурту, то аб ім добра, але даволі філасафічна, бо не пазначаныя ніякія даты, распавядаецца ў „Гісторыі krok": „Спачатку было цяжка. Наіўныя дзеці спрабуюць уявіць сябе ў выглядзе дарослых дзядзек з гітарамі. Зараз яны нудзяцца па тым часе, калі так радасна было амаль кожны дзень адкрываць нешта новае. Напрыклад, калі гітара і бубны гралі ў адзін рытм — гэта было крута! Яны самі не ведалі, навошта ім гэта было патрэбна. Напэўна, проста не хацелі вечнай цішыні ў душы. Людзі, клубы, сцэны, агні, танцполы, дым... Яны знаёмяцца з гэтымі словамі. Кажуць ім «прывітанне!»" Каму менавіта кажуць «прывітанне» дае адказ старонка «Who is who?», дзе размешчаны здымкі «крокаўскіх» музыкаў.

Каб непасрэдна пазнаёміцца з тым як і што спявае „Крок", варта зайсці на старонку „Музыка". Там у фармаце mp3 размешчаны некаторыя творы музыкаў, якія можна праслухаць, маючы адпаведнае абсталяванне.

Ну а той, хто хоча даведацца і аб іншых падобных гуртах, можа гэта зрабіць праз рубрыку „Спасылкі".

Уладзімір Лапцэвіч

У сустрэчы з украінцамі Беларусь дасягнула лепшага выніку ў сваёй гісторыі на чэмпіянатах свету серыі „А" — 9:1

Беларусь, беларусы...

Якасны зрух наперад

На юбілейным 70-м чэмпіянаце свету па хакеі, які праходзіць у сталіцы Латвіі, беларуская дружына зрабіла істотны крок наперад. Гутарка ідзе не пра выніковае месца (на момант напісання гэтых радкоў было яшчэ невядома, ці здолелі беларускія хакеісты трапіць у чвэрцьфінал), а пра злом аўтсайдарскай псіхалогіі і якасны зрух у змястоўнасці гульні. Відавочна, што канадскі трэнер Глен Хэнлан здолеў мабілізаваць падначаленых на больш сур'ёзныя рэчы, чым захаванне месца ў элітарнай кампаніі. Акрамя зменаў у настроі, заўважальныя і тактычныя змены (прыкладам, выпуск на лёд у большасці адразу 5 (!) форвардаў).

Ключавым матчам на першым этапе для нашых стаў стартавы паядынак са славакамі. Упартае змаганне завяршылася мінімальнай вікторыяй Беларусі — 2:1. Невыпадковасць гэтай перамогі пацвердзіла наступная гульня з Расіяй. Усходнія суседзі валодалі ініцыятывай, але беларусы здолелі не толькі параўняць лік, але і выйсці ў другім перыядзе наперад. Дадатковым „азонам" для тэлегледачоў былі бел-чырвона-белыя сцягі на трыбунах рыжскага палаца. На жаль, утрымаць станоўчы лік беларусам не ўдалося, у выніку параза — 2:3. У заключным паядынку групавога турніру з Казахстанам беларусаў задавальняла нават параза з малым лікам, але нашы выявілі сапраўдны прафесіяналізм і разграмілі супернікаў — 7:1.

На пачатку другога этапу Беларусь чакала выпрабаванне „Трэ крунур". Пасля паразы на алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці шведы маюць асаблівы настрой на беларусаў. У першым перыядзе скандынавы, у складзе якіх гуляе восем алімпійскіх чэмпіёнаў Турына, абрынулі на браму беларускага галкіпера Андрэя Мезіна сапраўдную ўраганную атаку і закінулі ажно чатыры шайбы. Здавалася, дружыну Хэнлана чакае катастрофа, але нашы здолелі захаваць твар, не склалі рук, змаглі закінуць шайбу. У выніку — 1:4. Затое ў наступнай сустрэчы з украінцамі Беларусь дасягнула лепшага выніку ў сваёй гісторыі на чэмпіянатах свету серыі „А". Нашы лічыліся безумоўнымі фаварытамі, але спрагназаваць выніковы лік 9:1 не здолеў, напэўна, ніхто. Шайбы закідваліся на любы густ, а асабліва вызначыўся Міхаіл Грабоўскі, які аформіў хетрык. Пасля Руслана Салея (ён не прыехаў на чэмпіянат таму, што паспяхова выступае ў Кубку Стэнлі за свой „Анахайм"), Грабоўскі — галоўная зорка беларускага хакея. Няма сумнення, што неўзабаве і ён апынецца ў НХЛ. А ў цэлым беларуская зборная зараз уяўляе досыць гарманічны калектыў з дасведчаных ветэранаў (Аляксандр Макрыцкі, Уладзімір Копаць, Алег Антоненка, Андрэй Скабелка) і перспектыўных маладых, якія „растуць" (Міхаіл Грабоўскі, Аляксей Угараў, Дзмітрый Мялешка, Андрэй Касціцын, Яраслаў Чупрыс). Яшчэ з моцных хакеістаў не здолеў узяць удзел у чэмпіянаце з-за траўмы цэнтрфорвард Аляксей Калюжны.

У заключным матчы другога этапу Беларусь 16 мая гуляла са Швейцарыяй. У залежнасці ад зыходу гульні Швецыя — Расія, нашых магла задаволіць і нічыя. Але галоўны вынік дасягнуты — беларусы змагаліся не за „выжыванне", а за раўнапраўнае месца сярод мацнейшых хакейных дружын свету.

Уладзімір Хільмановіч

Сандалі

— Хлопцы, ёсць дакладныя звесткі. Заўтра на мітынгу нас будуць біць як п'яны Яська жонку-гуляку! — як з пажару заляцеўшы ў партыйны офіс і не пераводзячы дыхання выгукнуў Пятро.

Гэтая навіна як бы і не была нечаканасцю. У Мінску ўжо даўно таўклі апазіцыянераў, якія адважваліся выходзіць на несанкцыянаваныя мітынгі. У Гродне яшчэ такога не было. Іх проста арыштоўвалі і кідалі на нары. Таму тыя мясцовыя змагары за дэмакратыю, якія мелі яшчэ і прэтэнзіі на лаўры філосафаў і мысліцеляў сучаснасці, цэлымі днямі ў апазіцыйных канторах і з вячэрнім працягам у якойсьці гродзенскай кнайпе за бакалам піва спрачаліся пра тое, як правільна называць існуючы рэжым: аўтарытарным, які чыста тэарэтычна можа развівацца як у бок таталітарызму, так і ў бок дэмакратыі, ці ўсё ж таталітарным, які ўжо даразвіваўся. Але пасля гэтай навіны спрэчкі пра назву рэжыму адышлі на другі план. Трэба было думаць што рабіць заўтра, бо планавалася паездка ў Мінск, дзе будуць біць. А што рабіць пры гэтым не было выпрацавана.

— Хай толькі паспрабуюць, — пачуліся галасы некалькіх чалавек, якія зусім нядаўна ўліліся ў адраджэнскія шэрагі і ўсімі сваімі дзеяннямі стараліся паказаць, што лепш за іншых разбіраюцца ў сітуацыі. — Мы падзяром ім морды як Тузік шапку. Здаецца, здароўя хапае, каб начысціць рыла некалькім сотням наёмнікаў.

Старэйшыя апазіцыянеры задумаліся і высноваў не агучвалі. Але з новымі таксама не спяшаліся спрачацца. Тады быў такі час, што калі адна з новых плыняў даволі жорстка абвінавачвала кіраўніцтва ў адсутнасці радыкалізму. Праз дзень пасля ўзгаданых падзеяў яны заткнуліся і маўчалі як куры ноччу, але ў той момант, яшчэ не паспрабаваўшы плячамі міліцэйскай дубіны, выглядалі вельмі адважнымі і рашучымі.

— Можа не лезці на ражон і не нажыць сабе праблемаў па дурноце, — засумняваўся Апанас. — Мы ж не ставім за мэту бойку з міліцыяй. Можа паспрабаваць пазбегнуць мардабою ды давесці да грамадства нашы думкі іншым метадам, а не ладзіць недазволены мітынг.

— Ага, забаяліся! — крыкнуў малады і гарачы Андрэй, нефармальны лідэр той новай плыні. — Як у партыйнае кіраўніцтва лезці, то вы там. Новых людзей не пускаеце. А як біцца, то разлятаецеся як пацукі ад пажару.

— Заткні сваё дзюбло, — не вытрымаў я. — Хопіць зяпу разяўляць. Як вырашыць Рада, так і будзе.

Андрэй замаўчаў. Яго паплечнікі таксама. Але назаўтра вырашылі мне адпомсціць. Думалі-думалі да чаго прычапіцца, і нарэшце дадумаліся. Да маіх сандаляў. Рада ўсё ж вырашыла праводзіць вулічную акцыю. На вуліцы зіма, мароз. А я прыйшоў у сандалях. Усе ведалі, што я другога абутку не нашу, бо ногі баляць. Але гэта не спыніла Андрэеву каманду.

— Глядзі не згубі свае сандалі, як пачнём біцца, — пачаў нехта з іх з іранічна-здзеклівым, як у п'янага філіна, голасам.

— Дзіва, што ты быў супраць бойкі, — працягваў дабіваць мяне другі. — У такім абутку шмат не наваюеш. Вось паглядзі, як мы падрыхтаваліся, не тое што ты.

Я глянуў на хлопцаў і аж пазайздросціў. Яны былі адзетыя ў адмыслова лёгкія, але цёплыя курткі, падпярэзаныя афіцэрскімі партупеямі. На руках, сціснутых заранёў у моцныя кулакі — чорныя скураныя пальчаткі. За пазухай дубовыя палкі. На нагах кароткія шнураваныя боты з такім пратэктарам на падэшве, што пазайздросцілі б колы калгаснага трактара. Ды на абцасах яшчэ і падковы набітыя. Я нават заганарыўся гэтай групай. Думаю, трэба на бліжэйшых выбарах прапанаваць іх у кіраўніцтва. Такія адважныя і рашучыя хлопцы...

Мае развагі перабіў хаатычны грукат. Я глянуў наперад і ўбачыў міліцэйскі шыхт, які, барабанячы дубінамі па шчытах, хутка набліжаўся да нас. Сярод некаторых людзей пачалася паніка. Мінакі і выпадковыя людзі пачалі ўцякаць. А хто ведалі, чаго выйшлі на вуліцу, пачалі гуртавацца і ствараць свой шыхт. Плячо ў плячо, локаць да локця. Праз імгненне насупраць міліцэйскага стаяў наш шыхт. Настрой быў трывожны і сур'ёзны. І тут я разрагатаўся, як у кума ў гасцях. Ад майго смеху, не тое што нашы, але і міліцыянты разгубіліся так, што нават спыніліся. А я не мог спыніць смеху, бо, паглядзеўшы па-баках, я не заўважыў аніводнага ў тых трактарных ботах, якія абяцалі разагнаць усю сталічную міліцыю разам з мірным насельніцтвам. Усе паўцякалі, напалохаўшыся. Як ветрам здула. Як карова языком злізала. А ў шыхце стаялі людзі звычайна апранутыя. У звычайных паліто ды куртках, звычайных шапках, звычайных зімовых бацінках. І яшчэ я, у сваіх сандалях.

Генрых Западашмянскі

Агароднікі адварочваюцца ад Буга

На схіле сёлетняй вясны еўрапейскія сродкі масавай інфармацыі шмат інфармавалі пра той патоп, які ўчыніў Дунай у Сербіі, Балгарыі і Румыніі. А калі нашы польскія СМІ згадалі, што хоча разліцца Буг, дык і падаўся я ў напрамку гэтай ракі, што перасякае цэнтр гістарычнага Падляшша.

У Малой Турне вялікай вады не было відаць. Праўда, вада заліла толькі дарожку, што ад вёскі вядзе да Буга, але высока не паднялася. Не было відаць ніякага разліву і каля Вулькі. За Вулькай, у напрамку Агароднік, дзе-нідзе стаяла вада ў ніжэйшых месцах, якія, мабыць, пакінуў яшчэ ледавік. У старым, застойным русле Буга пара лебедзяў рупліва працавала, даследуючы глыб вадаёма. Калі я з дарогі падышоў да берага глянуць на тых птушак, якія ў нас прынялі першы ўдар апакаліптычнага грыпу, яны толькі спачатку зірнулі ў мой бок, пазней зусім праігнараваўшы мяне, зноў хаваючы ў ваду свае галовы.

Да Буга падышоў я перад Агароднікамі. Тут высокі бераг, але вада ўсур'ёз не паднялася, крыху заняла толькі прыбярэжныя дрэвы.

У пачатку Агароднік, з боку Вулькі-на-Бугу, два крыжы: адзін драўляны, стары, пра якога пачаткі не помняць нават сённяшнія старажылы, і навейшы, з бетоннай падставай, пастаўлены 9 чэрвеня 1972 года. Калісь побач яго вывозілі пакойнікаў на могілкі ў Сямятычы, але калі з другога канца вёскі паклалі асфальт на дарозе ў Клекатава, тады і пакойнікаў сталі вадзіць лепшай дарогай; а старыя крыжы асталіся.

З вясковай вуліцы адкрытая прастора ў бок магутнага Буга. Яна засцелена чыстым пясочкам, які ўтварае тут абшырны пляж; расце тут толькі крыху ядлоўцаў. Дзякуй Богу, што моднае Рыо-дэ-Жанейра, а не нашы Агароднікі, а то і тут заміж тых ядлоўцаў быў бы летам тлум распранутага народу як на слаўных пляжах Іпанемы ці Копакабаны.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Але Агароднікі, як сказаў бы Астап Бендэр, гэта не Рыо-дэ-Жанейра і няма тут турыстычнай інфраструктуры. Архітэктура тут разнастайная: ёсць традыцыйныя драўляныя мясцовыя хаты, але ёсць і вялікія дамы, пастаўленыя за заробленыя за граніцай грошы. Бо жыць у вёсцы цяпер цеснавата і людзі пакідаюць яе задоўга да таго моманту, калі іх продкі развіталіся каля вывадных крыжоў.

Мяняецца і прырода. Як расказвае Аляксандр Вакулюк, народжаны ў Агароднікі у 1924 годзе, калісь Буг у паводку разліваўся аж да Клекатава, а ніжэйшы канец Агароднік залівала вада; падыходзіла яна аж да вокнаў падвалаў. Лодкамі да хатаў падплывалі; цяпер такіх патопаў няма.

Агароднікамі вёску назвалі, мабыць, таму, што недалёка былі агароды слохаўскіх сялян. І людзі ў Агароднікі жылі з зямлі. Некаторыя, хто мог і хацеў, лавілі рыбу. Хадзілі з кломлямі, бродняміі, а хто і з калыскаю вялікаю, па-над берагам, у зялёным; рэчка спакойная была.

Калісь Буг глыбейшы быў, машыны па ім хадзілі; не тое, што цяпер, калі плыткая вада, што летам перайсці можна. Калісь, яшчэ нават пасля вайны, праз Буг трэба было перапраўляцца на пароме. А даставацца на другі бераг трэба было, каб збожжа змалоць. Бо з нашага берагу не было вялікіх млыноў; у Клекатаве быў, але слабы. А з другога боку Буга, у Дражневе, Рудзе і Такарах былі вялікія водныя млыны на рацэ Точнай. І ў Сарнаках быў вялікі паравы млын. Кулінскі з Мянжэніна меў паром, на якім змяшчаліся чатыры фурманкі. Паром той быў з вялікіх бярвенняў. Спачатку прыводзілі яго ў рух доўгімі дручкамі, адпіхаючыся ад дна. А пасля між берагамі працягнулі канат і з дапамогай лябёдак перамяшчалі паром з грузамі. А калі па Бугу ішла машына, тады яна спынялася перад канатам, пішчала, і або мы, або тыя з другога берага беглі і спускалі канат на дно, каб машына яго не парвала.

Людзі і свае лодкі мелі, але не ўсе. Хто на рыбу хадзіў, той меў. Сусед такія лодкі выраблялі, з сасновых дошак.

Між вёскай і рэчкай ляжыць адна такая струхлелая лодка. Некалькі гадоў таму хадзіў я каля Агароднік на Буг і там былі прывязаны да калочкаў тры лодкі. Але Агароднікі адварочваюцца не толькі ад Буга. У вёсцы асталося толькі трох буйнейшых гаспадароў, а іншыя адварочваюцца і ад зямлі: мелі кароў і іх папрадавалі. Калісь гаспадары трымалі гусей і качак — ад вёскі да ракі бела было. І коней трымалі, і авечак. І сам спадар Вакулюк быў прыдбаў сынам усе машыны, але яны неахвотна глядзяць на іх. Адзін сын з сям'ёй зарабляе ў Бельгіі і, глянуўшы на ягоны, найбольшы ў вёсцы, новы дом, цяжка аспрэчваць ягоны выбар.

Але вёска яшчэ шпаркая. Жыве тут за сто душ, а з іх толькі адна касцельная, а ўсе апошнія — царкоўныя. І дзяцей тут шмат; калі я ішоў у напрамку Клекатава, у Агароднікі паехаў не толькі гімбус, але і пэкаэсаўскі аўтобус са школьнікамі.

У вёсцы будынак пажарнага дэпо, дзе кожную пятніцу бацюшка з Сямятыч адпраўляе набажэнствы, на якія ходзяць пераважна жанчыны. А мужчыны больш трымаюцца крамы. Крама, пастаўленая вяскоўцамі, працуе амаль цэлы тыдзень, нават у нядзелю, калі прадаўшчыца захоча. Не працуе толькі ў большыя святы. І адкрываецца яна ўжо ў сем гадзін, каб свежы хлеб прыняць. А ў летні сезон адкрываецца і прыватная крама. І аўтакрамы ездзяць, і „рускія" часта заглядаюць, паліва зліваюць.

Да таго ж людзі маюць свае машыны, на якіх ездзяць не толькі па справах, але і за пакупкамі. І едуць куды каму зручней: або ў большыя Сямятычы, або ў ціхі Драгічын.

Калі я зайшоў у дом спадара Вакулюка, там гуляў ягоны праўнучак, дашкольнага ўзросту. Я пацікавіўся, на якой мове там гаворыцца. Той хлопчык адразу заявіў мне, што па-польску. Але гэта толькі ягоныя азы. Неўзабаве маім старажылам трэба стала высветліць пільныя бытавыя справы з малодшымі сямейнікамі. І аказваецца, што рабіць гэта найзручней на мове продкаў.

Аляксандр Вярбіцкі

Нарада ў Чаромсе

28 красавіка праходзіла XXII сесія Рады гміны ў Чаромсе. Асноўнай тэмай пасяджэння была ацэнка выканання мінулагодняга бюджэту і дзейнасці войта ў гэтым перыядзе. У сесіі ўдзельнічаў старшыня Рады павета Мікалай Міхалюк. Да парадку сесіі войт прапанаваў дадаць пункт аб прыёме рашэння па разліку камандзіровачных радных. Аргументаваў ён гэта патрабаваннямі Разліковай палаты. Прапанова была адхілена, так як і заява раднага Міраслава Лук'янюка наконт зачытання пратакола Рэвізійнай камісіі з праведзенага кантролю фінансаў у Гімназіі і Гміннай управе. Дэпутаты адмовіліся таксама абмяркоўваць справу вызвалення з пасады кандуктара раднага Яўгена Тыханюка.

З працай Управы гміны ў перыядзе паміж сесіямі пазнаёміў радных войт гміны Міхал Врублеўскі, а скарбнік Міраслава Кандрацкая-Найбук зачытала справаздачу аб рэалізацыі гміннага бюджэту. Затым адбылося галасаванне. Справаздача і дзейнасць войта былі адобраны васьмю галасамі пры двух галасах супраць і трох, якія ўстрымаліся ад голасу.

Інтэрпеляцый радныя не выносілі. У пункце „пытанні і прапановы" дыскусія засяродзілася вакол рамонту дарог і дарожных інвестыцый. Радны Турык, напрыклад, пытаў каго вінаваціць за неахайны рамонт дарогі ў Ставішчах і прапанаваў выраўнаваць роў пры вуліцы Длугай. Радны Жук патрабаваў падсыпаць жвірам вуліцу Мёдавую, а Уладзімір Сідарук прапанаваў асфальтаваць дарогу побач царквы, якая вядзе ў Рэпчычы і пераняць участак поля ад чыгункі на вуліцы Вонскатаровай і пачаць рамонт дарогі неабходнай кузаўскім школьнікам. У апошняй справе выказаўся таксама радны Найбук, які паінфармаваў, што Радай быў прыняты праект на афармленне дакументацыі, а затым на пабудову дарогі Кузава — Рэпчычы. Старшыня Рады павета Мікалай Міхалюк паінфармаваў, што Паватовае праўленне публічных дарог у Гайнаўцы абавязалася завяршыць будову чаромхаўскага тратуара з вёскі Чаромхі ў пасёлак, паколькі інвестыцыя доўжыцца ад васьмі гадоў. Паведаміў ён таксама, што будзе асфальтавана дарога ў Мядзвежыкі. Войт падзякаваў старшыні Рады павета і старасту за так каштоўную здзелку. **(ус)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Мікалай Лук'янюк

Нарадзіла

Нарадзіла маці дзетак,
Шчыра даглядала,
Столькі начэй не даспала,
Як іх калыхала.

Дзеткі сталі падрастаці
І пайшлі ў школу,
Новенькія сшыткі, кніжкі
Ім бацькі куплялі.

Як закончылі навуку,
Сталі працаваці,
А старэнькія бацькі
Кватэры ім купляці.

За кватэрай — самаход,
Каб была выгода.
Няхай усе суседзі знаюць,
Што з лепшага роду.

А калі абсталявалі
Дзецям усе выгоды,
Бацькам сілы не хапіла —
Не хапіла згоды.

Цяпер дзеткі не шануюць
Ні бацькі, ні маці,
У дом састарэлых
Хочуць іх аддаці:

Няхай там чужыя рукі
Бацькоў даглядаюць,
Бо яны ўжо цяпер
Грошай ім не маюць.

Вось як дзетачкі цяпер
Пра бацькоў не дбаюць,
Што бацькі для іх зрабілі,
Аб тым забываюць!

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

З мегафона на пляжы раздаецца аб'ява: „Жанчыну ў чырвоным касцюме з белым клінам просім прыйсці ў гардэроб. Вы забылі яго адзець!"

* * *

Калі да заўтра не атрымаю гэтага мільёна злотаў, то трэба будзе стрэліць сабе ў лоб. Будзь сябрам, паратуй!

— Прыкра мне, але не маю пісталета.

* * *

Жанчыну на пешаходным пераходзе зачапіў веласіпедыст. Яна ўзняла крык, а ён тлумачыць:

— Чаго крычыш! Богу дзякуй, бо маеш шчасце, што толькі так штурхануў...

— Якое шчасце?

— Сёння ў мяне выхадны і я ездзіў веласіпедам, а ў рабочы дзень я звычайна кірую аўтобусам.

* * *

— Татачка, хто гэта такі стары халасцяк?

— Гэта, сыночку, такі мужчына, які патрабуе жонкі, але вельмі шчаслівы, што яе не мае.

Родныя краявіды

Каплічка каля Новага Корніна Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пажаданне.

1. лічыльная дошка ў старажытных грэкаў і рымлян = 11 __ 3 __ 2 __ 1 __;
2. напр. марафон = 27 __ 13 __ 10 __;
3. выгнутая частка вупражы, якая змацоўвае аглоблі з хамутом = 22 __ 23 __ 24 __ 25 __;
4. крывяносны сасуд = 4 __ 5 __ 6 __ 9 __;
5. рака, што навадняе казахскае возера Балхаш = 16 __ 14 __ 15 __;
6. кухонная прыправа з пякучым смакам = 18 __ 19 __ 20 __ 21 __ 12 __;
7. халодная краіна за Уралам = 17 __ 7 __ 8 __ 32 __ 26 __;
8. не душа = 29 __ 30 __ 31 __ 28 __. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 15 нумара

„Аіда", бяда, Гея, Еўле, мода, плоў, рой, ціша, чэх.

Рашэнне: **Добрае доўга ў памяці, а ліхое яшчэ далей.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

21.05 – 27.05

Баран (21.03. — 19.04.) Квадратура Венеры з Марсам выявіць усе напружанасці ў тваёй пары. Не абыдзецца без сваркі (тыя непаладкі табе мала зашкодзяць). Някепскія фінансы. Адсутнасць крытыцызму ў дачыненні да сяброў; не заўсёды добра на гэтым выходзіцца.

Бык (20.04. — 20.05.) Да 22.05. ты ўсё вельмі рамантычны, уражлівы. 24-27.05. нагоды да паглыблення сувязі з партнёрам, гарачыя жарсці. 21-25.05. могуць быць таксама гарачыя сваркі ды скандалы, разрадзіцца прыйдзецца больш інтымна. 23-27.05. самотныя Быкі будуць асабліва ўражлівыя на ўсе спробы схіліць іх да сужонства (ірытацыя!).

Блізняты (21.05. — 21.06.) Маладзік Месяца ў знаку Блізнят адкрые новы раздзел у тваім жыцці. Знойдзеш сілы рэалізаваць тое, што адкладваў на пасля. Магчымыя добрыя заробкі — не забыў як гэта робіцца! Шмат часу правядзеш з сяброўкай ад сэрца; калі ты Блізнюк-мужчына, можа між вамі моцна заіскрыцца!

Рак (22.06. — 22.07.) Квадратура Марса і Венеры прабудзіць у табе схільнасць да здрады і ахвоту сустрэцца са старым каханнем. Перасякаючы межы розуму, можаш наскандаліць. 24-27.05. не выбірайся ў доўгае падарожжа на аўто.

Леў (23.07. — 22.08.) Добра складуцца твае адносіны са старэйшымі асобамі; яны могуць табе вельмі шмат у чым памагчы. Можаш крыху аддыхацца ад працы. Проста незямныя жарсці (24-27.05.)!

Дзева (23.08. — 22.09.) Час спрыяючы замежным падарожжам, пералічванню грошай у пукатым кашальку, кар'еры, новым знаёмствам. Маладзік Месяца (27.05.) можа быць пачаткам вялікай кар'еры! Можаш пазнаёміцца з людзьмі, якія пакажуць табе новыя мэты ў жыцці.

Шалі (23.09. — 22.10.) Можаш справіцца з усім, на што дагэтуль звычайна не было часу. Найбольш падтрымае цябе асоба, з якой жывеш; з ёю будзеш адчуваць сябе бяспечна. 21-25.05. можа табе праляцець каля носа нагода, якой ты здаўна чакаў.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Вялікі матэрыяльны поспех — грошы проста да цябе ліпнуць. Поспехі таксама ў каханні. Па галаве ходзяць думкі пра нейкія рэзкія змены.

Стралец (22.11. — 21.12.) Не ўпірайся пры тым, што заўжды маеш рацыю. Інтэнсіўныя эмоцыі. Пазбягай зайздрасці. Ідэальны час рабіць кар'еру. 27.05. нагода падпісаць дамову, наладзіць шматперспектыўныя знаёмствы.

Казярог (22.12. — 19.01.) Да 24.05. спакой, калі нават будзеш у стрэсе. Дагаворышся з людзьмі, ад якіх залежыць твая прафесійная будучыня. Добрая інтэлектуальная форма.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Будзь асцярожны, каб не трапіць у канфлікт з кімсьці ад каго залежыць твая будучыня. Будзь асцярожны з дэкларацыямі, ад якіх цяжка будзе вызваліцца.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Карысці ад выездаў, сустрэч, бізнесовых размоў. На канец месяца на рахунку будзеш мець немалую суму.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960